Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз. Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. 3 — 2 р. 70 к. 6 — 4 р. — к. 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародніх — 20 к. мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нонпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нонпарэлі насупроць тэксту 1 р. — к. За радок нонпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьлепшыня на 50 проц. даражэй. Зьмен тарыфу бярэцца 10 проц. надбаўкі.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт 35 кап. За кожны дадатковы 15. Беспрацоўн. і пэрсанальныя за дакумэнт 13. За кожны дадатковы 5. Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

НАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ... канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

10 год выданьня. — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 235 (2724) Нядзеля, 13-га кастрычніка 1929 г.

НАПЕРАД, ДА БУЙНАГА КАЛЕКТЫЎНАГА ЗЕМЛЯРОБСТВА!

ЗА ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЮ, ЗА ЎЗДЫМ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі разгорнем сацыялістычнае наступленьне ў горадзе і вёсцы

Сапраўднае сацыялістычнае сьвята.

14 кастрычніка ў гэтым годзе, як і ў мінулыя гады, праводзіцца дзень ураджаю. Гэтаму дню зараз прыданы другі зьмест і напрамак, зрабіўшы яго „Днём ўраджаю і калектывізацыі", ператварыўшы яго ў вялікае сьвята шырокіх працоўных калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, а таксама і працоўных гораду. Гэты дзень зьяўляецца днём шырокай праверкі праробленай працы як калгасамі, саўгасамі, так і індывідуальнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі ў справе ўздыму ўраджайнасьці, паляпшаньні жывёлагадоўлі і г. д., а таксама днём яшчэ большай мабілізацыі ініцыятывы і самадзейнасьці працоўных мас за сацыялістычную рэканструкцыю (перабудову) сельскае гаспадаркі і наступленьне на кулака.

Пастаўленыя камуністычнай партыяй задачы аб рэканструкцыі сельскае гаспадаркі на сацыялістычных пачатках, праз калектывізацыю, добра ўразумелі бядняцка-серадняцкія пласты сялянства. Гэта пацьвярджае той шырока разгорнуты калгасны рух, які зараз адбываецца як па ўсяму Савецкаму Саюзу, так і на Беларусі. Калі да пастаноў XV Зьезду ЎсеКП(б) налічвалася калгасаў у БССР—440, дык зараз іх ёсьць каля 1.600—павялічэньне амаль што ў 4 разы (на 286 проц.).

Калі раней калгасы арганізоўваліся ў большай частцы дробныя і на землях дзяржфонду, дык зараз яны арганізоўваюцца на землях працоўнага карыстаньня і на больш буйных плошчах. Усё гэта патрабуе, каб калгасы ў дзень ураджаю сталі ў першых шэрагах арганізатараў па ператварэньню папоўскага сьвята «пакровы», дня п'янкі і брыдоты, у дзень свайго—сапраўды працоўнага сьвята—сьвята калектывізацыі.

Калгасьнікі! У гэты дзень вы павінны самі падвесьці вынікі сваіх дасягненьняў у справе падняцьця ўраджайнасьці і наогул вашага гаспадараньня, а таксама культурна-бытавога ўкладу. Усе свае дасягненьні ў гэтым напрамку прадэманструйце і пакажэце шырокім бядняцка-серадняцкім масам вёскі, што для ўздыму культурнага жыцьця сялянства і ўздыму сельскае гаспадаркі ёсьць толькі адзіны шлях—шлях калектывізацыі. Таму на арганізуемых раённых выстаўках вы павінны заняць адпаведнае месца з вашымі экспанатамі. Апрача таго, вы павінны стаць у гэты дзень арганізатарамі сходаў сялян, канфэрэнцый і парад, на якія пасылайце сваіх дэлегатаў. На гэтых сходах і нарадах рабеце даклады, справаздачы і расказвайце аб вашых дасягненьнях сялянству, разьбівайце ўсю кулацкую хлусьню, якая зараз вядзецца кулакамі супроць калектывізацыі. Памятуйце аб пастаўленых камуністычнай партыяй і савецкай уладай велізарных задачах аб індустрыялізацыі краіны, падвышэньні ўраджайнасьці, аб лепшым культурным вядзеньні сельскае гаспадаркі, праз шырокае разгортваньне калектывізацыі і г. д. Дзеля выкананьня гэтых задач трымайце шчыльную сувязь з навуковымі ўстановамі і аграномамі, набывайце аграномічныя веды, ужывайце лепшыя мэтады вядзеньня гаспадаркі, узбуйняйце свае гаспадаркі праз далучэньне да сябе вакольных сялянскіх гаспадарак, цьвёрда памятуйце, што перавага—у рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і прымяненьні тэхнікі—за буйнай гаспадаркай. У „Дзень ураджаю і калектывізацыі" арганізавана здавайце дзяржаве ўсе вашы таварныя лішкі збожжа, сыравіны і інш. прадукты праз каапэрацыю. Арганізуйце чырвоныя абозы і ўцягвайце ў іх сялянства. Ганеце ад сябе ўсіх спэкулянтаў, марадзёраў і кулакоў, ворагаў калектывізацыі і савецкай улады, не давайце ім нажывацца на вашай працы.

Дапамагайце беднаце вашым інвэнтаром па ўборцы ўраджаю і засеву палёў. Арганізуйце беднату ў калгасы і вырывайце яе з кабалы кулака. Усю гэту працу праводзьце пад пунктам погляду лепшага выкананьня памянёных задач—разгарнеце шырока сацыялістычнае спаборніцтва паміж сабою, саўгасамі і пасёлкамі. Праверце, як выкананы і выконваюцца ўжо заключаныя дагаворы па спаборніцтву.

Арганізуйце ў сябе ўрачыстыя сходы і вечары, прысьвечаныя „Дню ўраджаю і калектывізацыі", прыцягнеце да ўдзелу ў іх акаляючае сялянства. Сумесна з ім падвядзеце вынікі праробленае працы і адзначце далейшыя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьню задач, пастаўленых камуністычнай партыяй і савецкай уладай.

Усе сілы і сродкі на дапамогу дзяржаве будаваць сацыялізм.

Ніводнага калгасу і калгасьніка не павінна быць без аблігацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

СЬМІРНОЎ.

У сучасны пэрыяд задача аб'яднаньня і ператварэньня дробных індывідуальных гаспадарак у буйныя калектывы павінна быць пастаўлена ў якасьці асноўнай задачы партыі ў вёсцы.

З рэзалюцыі XV зьезду УсеКП(б).

ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ

РАБОТНІКАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СЭКТАРУ С. ГАСПАДАРКІ

„Дзень ураджаю і калектывізацыі" павінен быць днём узмацненьня сувязі пралетарыяту і асноўных колаў сялянства, узмацненьня фактычнага ўдзелу і кіраўніцтва з боку пралетарыяту сацыялістычнай перабудовай вёскі.

У „Дзень ураджаю і калектывізацыі" наладзім масавую праверку вынікаў сац. спаборніцтва на вёсцы, яшчэ больш энэргічна разгорнем працу па ўздыму працоўнай дысцыпліны і падвышэньню ўраджаю ў саўгасах і калгасах.

Забясьпечым выкананьне і перавыкананьне тэмпаў калгаснага і саўгаснага будаўніцтва, 5-цігадовага пляну разьвіцьця прамысловасьці, культуры і сельскае гаспадаркі.

У „Дзень ураджаю і калектывізацыі" пылкае пралетарскае прывітаньне работнікам сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі.

Прэзыдыум ЦСПСБ.

ВЫЕЗД ЧЛЕНАЎ ЦВК У РАЙЁНЫ.

Прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў камандыраваць у райёны для ўдзелу ў правядзеньні „Дню ўраджаю і калектывізацыі" 31 члена ЦВК—адказных працаўнікоў цэнтральных устаноў.

Камандыраваныя таварышы выяжджаюць непасрэдна ў вёскі, буйныя калгасы і саўгасы.

Гэтым таварышам Прэзыдыум ЦВК БССР даручыў дасканала праверыць выкананьне мерапрыёмстваў ураду па падняцьці ўраджайнасьці і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, а таксама правесьці на месцах агітацыйную працу за далейшае падняцьце ўраджайнасьці і шырокае разьвіцьцё буйнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫЯ МАШЫНЫ Ў КАЛГАСЫ.

Нова пабудаваны машынабудаўнічы сельска-гаспадарчы завод у Гомелі, які складаецца з 6 карпусоў.

Завод заканчваецца на 8 месяцаў раней тэрміну.

ПЯТРУСЬ БРОЎКА.

НА НОВЫЯ МЫ СЕЛІ РУБЯЖЫ.

Вечары рубінныя
— аўсяная замець...
Сустракай, радзімая,
мёдам, пірагамі.

Белаю сарочкаю
надары ты сына,
бо пайшла упрочкі
мачыха-мякіна.
І каўнер узорамі
расфарбуй-жа насінімі.
Ды ня так, як ўчора мне,
васількамі краскамі.

Ты яе кужэльную
вышпігуй калосьсямі,
што бадзяньне беднае
выжыць давялося нам.

І па тым патрачаным
сёньня не маліся...
— Пахваліся працаю,
плённай пахваліся.

* * *

О, сын,
мой сын, далёкі і каханы!
Ці плакаць мне,
ці плакаць і тужыць?!
Залечыўшы пакінутыя раны,
на новыя мы селі рубяжы.

Другое тут,
інакшае зусім,
і дні яснейшыя на зараве пылаюць...
Гаворыць старая,
а валасы, як дым,
і на вачох усьмешка дагарае.

Быў сход у нас:
крычалі і раўлі,
шапталі, біліся, сьмяяліся і кпілі...
А толькі большасьцю
мы новае знайшлі
і вось на тым, канешне, парашылі.

О, маці любая,
начуціца мая!

Ці гэта ты,
ці ты гэта сьвгоньня?!
Прысадамі, як промені маяк,
лістамі жоўтымі рабіна рвеіць.

Я слухаю.
І радасна мне так,
а сэрца-звон
нястрымана калоціць,
што на гумне пад нейкі дзікі такт
снапы дымлівыя малоцяць.

І вось цяпер
ты бачыш, як у нас:
другія дні і гутаркі другія
— мы вёскаю наладзілі калгас —
ўзаралі межы, трактар мы купілі.

Я прытуліўся,
змоўчыў і глядзеў...
Ці гэта так
— задумаліся самі.
А на гары узрушаны вятрак
махаў размашыста крыламі.

... Сказалі —
млын збудуем паравы,—
партыйны сход учора з комсамолам.
Плылі у выраў
статкам журавы
над новаю калгасаўскаю школай.

І я ня знаў,
ўстрывожаны да сьлёз,
што мне сказаць,
бо губы анямелі...
Пад гомам восенскі
пабеленых бяроз
кудысьці вочы прагнасьцю глядзелі.

О, так!
Другое тут,
інакшае зусім,
і дні ясьнейшыя на зараве пылаюць...
Гаворыць старая,
а валасы, як дым,
і на вачох усьмешка дагарае...

Я. ІВАШЫН.

Шлях калектыву.

*Мы шыбаем няспынна
грамадою нязломнай
па вялікай дарозе жыцьця,
і узьлётам арліным
уздымаюць нас домны—
пераможны нам сьпеў шалясьцяць.*

*Мы спалілі заломы,
ўскаласілі загоны
калектыўнай сталёвай рукой,
Перашкоды мы зломім
гартаваньнем—разгонам
і разьвеем туманы вякоў.*

*Наша яў—нашы будні,
будні творчага пэнту,
што буяе нязгаслым агнём.
Калектывам магутным
у будове вялікай
мы няспынна наперад ідзём.*

*Мы напорна узьняты
завірухай змаганьня,
ў нашым руху хістаньняў няма,
Хай наш вораг зацяты
не сьмяецца так рана:
ён наш поступ ня зможа
стрымаць!*

*Мы шляхі працярэбім
да Сусьветнай Камуны—
красаваньнем зазьзяе жыцьцё.
Дык вышэй-жа наш сьветач,
каб ён хутка над сьветам
праменьні свае распасьцёр!..*

*Нас імпэтам арліным
узьвіхурылі домны,
пераможны нам сьпеў шалясьцяць.*

*Мы шыбаем няспынна
калектывам нязломным
па вялікай дарозе жыцьця.*

РАЗГОРНЕМ РАБОЧАЕ ШЭФСТВА

над калгасамі і над усёй калгаснай сыстэмай.

Рабочыя масы ідуць на падмогу партыі, с-г. пралетарыяту і бядняцка-серадняцкай масе вёскі ў іх барацьбе супроць кулацтва. Дабрахвотныя адпрацоўкі рабочых на будаўніцтва калгасаў, на арганізацыю трактарных калён, пасылка рабочых брыгад у вёскі, каштоўная ініцыятыва маскоўскіх, ленінградзкіх, іванава-вазьнясенскіх тэкстыляў, якія разгарнулі зараз вялікую кампанію па аказаньню практычнага садзейнічаньня разьвядзеньню бавоўны ў Сярэдняй Азіі, і, нарэшце,— найкаштоўнейшая ініцыятыва рабочых маскоўскага электразаводу, узяўшых пад сваё шэфства зернасаўгасы—вось чым адказвае рабочая кляса на супраціўленьне кулацтва супроць калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

І рух сялянскіх мас за калектывізацыю, і масавы рух гарадзкіх рабочых зьяўляюцца лепшым адказам таксама і ўсім малаверам і правым ухілістам на іх пявер'е ў жыцьцёвасьць генэральнай лініі партыі. Трэба зараз зрабіць усё, каб ня даць распыліцца найкаштоўнейшай ініцыятыве і энэргіі рабочых мас. Унесьці плянавасьць і максымальную арганізаванасьць у ўзрастаючы па гарадох рух—вось задача дню.

16 усесаюзная партыйная канфэрэнцыя гаворыць у сваіх пастановах наступнае: „...Новы пэрыяд і новыя формы змычкі вымагаюць значнага ўзмацненьня сувязі пралетарскага гораду з вёскай як мэтаду ўзмацненьня кіруючай ролі рабочай клясы ў краіне. Пастаўленая Леніным у 1923 годзе задача разьвіцьця сувязі паміж рабочымі і сялянамі, устанаўленьня паміж імі самых разнастайных форм таварыства зьяўляецца ў сучасных умовах адным з важнейшых абавязацельстваў і задач рабочай клясы, якая змагаецца за сацыялістычную перабудову вёскі"...

Другая пастанова канфэрэнцыі вызначае асноўны напрамак і формы ўдзелу савецкага гораду ў перабудове сельскай гаспадаркі. Яна гаворыць: „...Абавязаць партыйныя і савецкія органы прамысловых акруг узмацніць арганізацыйную і палітычную дапамогу сельска-гаспадарчым акругам, падрыхтоўваючы для іх кадры вылучэнцаў і пасылаючы работнікаў на сталую і часовую работу. Такая дапамога павінна ў грунце мець удзел дзяржаўных і каапэрацыйных органаў рабочых цэнтраў ва ўзьняцьці сельскай гаспадаркі іншых раёнаў. Напрыклад, удзел рабочай каапэрацыі ў рабоце с.-г. каапэрацыі, як па загатоўцы с-г. прадуктаў, так і па разьвіцьцю адпаведных галін сельскай гаспадаркі, удзел ільняной прамысловасьці ў падняцьці ільнаводчых райёнаў і г. д.".

Для выкананьня гэтых дырэктыў неабходна па нашай думцы наступнае:

Распачаць арганізацыю **масавага шэфства рабочых над** калгасамі, у першую чаргу над **райёнамі поўнай калектывізацыі** і буйнымі калгасамі. Адначасова трэба распачаць арганізацыю масавага і плянавага вылучэньня рабочых па лініі ўсёй калгаснай сыстэмы і на мясцох з мэтаю аказаньня грамадзкага рабочага садзейнічаньня арганізацыі кантролю мас і арабачэньню апарату.

Асноўным ядром рабочых, якія бяруць шэфства і арганізуюць работу садзейнічаньня калгаснай сыстэме, павінны зьяўляцца рабочыя, якія заняты на прадпрыемствах **с.-г. машынабудаўніцтва** і якія перапрацоўваюць с-г. сыравіну.

Пытаньне аб шэфстве і аб садзейнічаньні рабочых Калгасцэнтру і яго сыстэме па мясцох ужо пастаўлена на абгаварэньне ў першую чаргу рабочых Любарэцкага, Каломенскага, Пуцілаўскага і інш. фабрык і заводаў, вырабляючых с-г. машыны і прылады для калгасаў і саўгасаў.

Уся работа па прынцыпу шэфства над райёнамі поўнай калектывізацыі і буйнымі калгасамі павінна весьціся пад агульным кіраўніцтвам партыі і **зьвязваць непасрэдна рабочыя масы** з с-г. пралетарыятам і сялянамі-калгасьнікамі.

Асноўнай формай па правядзеньню шэфства рабочых над калгасамі і для ўдзелу ў рабоце калгасных цэнтраў павінны зьявіцца **рабочыя брыгады калектывізатараў і арганізатараў**. Асноўныя задачы іх: уцягненьне рабочых мас у калгаснае будаўніцтва, арганізацыя масавай інфармацыі рабочых аб задачах, стане і разьвіцьці калгаснага руху, папулярызацыя **пацігодкі** калгаснага будаўніцтва, арганізацыя плянавага вылучэньня рабочых па лініі ўсёй калгаснай сыстэмы, аказаньне практычнай арганізацыйнай **дапамогі Калгастрэсту** і яго мясцовай сыстэме, інструктаваньне ад'яжджаючых на месцы рабочых брыгад па пытаньнях калгаснага будаўніцтва і, нарэшце, **вопытна-паказальная работа** на мясцох для выпрацоўкі на масавым вопыце новых мэтадаў форм у калгасным будаўніцтве.

Я. Бураў.

Трактары прыбылі.

Дзень ураджаю і калектывізацыі павінен зьявіцца пачаткам вялікага паходу рабочае клясы, усяе савецкае грамадзкасьці і вясковага актыву за калектывізацыю вёскі, ён павінен зьявіцца дэманстрацыяй нашых дасягненьняў у галіне калектывізацыі.

РАЧЫЦКІ.

БОЛЬШ УВАГІ КУЛЬТПРАЦЫ У КАЛГАСАХ.

Велізарны размах калгаснага руху, якім у сучасны момант ахоплена вёска, ставіць актуальную задачу ўзмацненьня культурнай працы сярод калгасьнікаў, прыстасаваньня яе да абслугоўваньня шырокіх пластоў працоўных. Належная пастаноўка культпрацы будзе садзейнічаць узмацненьню калгасаў, лепшай пастаноўцы ў іх гаспадарчага становішча і далейшаму росту калгасаў за лік бядняцка-серадняцкіх індывідуальных гаспадарак.

Трэба адзначыць, што тэмп разгортваньня культпрацы ў значнай меры адстае ад шырокага размаху калгаснага будаўніцтва.

У сучасны момант на тысячу з лішнім калгасаў ёсьць: ясьляў 98, дзіцячых пляцовак 60, клюбаў і чырвоных куткоў 120, школ 20, ёсьць хаты-чытальні, 148 бібліатэк, значная колькасьць калгасаў радыёфікавана і т. д. Калі прагледзець у дынаміцы рост сеткі культустаноў, то мы убачым, што дасягненьні ёсьць, але яны значна адстаюць ад буйнага росту калгасаў.

Асноўная, ударная задача, на якой павінна быць згуртавана ўвага органаў АНА, саюзу працасьветы, усіх ... непісьменнасьці сярод рабочых саўгасаў і калгасьнікаў. 1929-30 навучальны год павінен быць годам пагалоўнага ўцягненьня ўсіх рабочых саўгасаў і калгасьнікаў на лікпункты. Гэту ўдарную задачу трэба абавязкова вырашыць.

Буйны рост калгасаў патрабуе пашырэньня сеткі культасьветных установаў наогул і прыстасаваньня яе да найлепшага абслугоўваньня калгасьнікаў. Школы, хаты-чытальні, клюбы, бібліатэкі і г. д. павінны ў першую чаргу адчыняцца ў калгасах. Наркамасьветы, саюз працасьветы, палітасьветныя ўстановы, Калгасаюз павінны намеціць заразжа шэраг мерапрыёмств па пытаньню пастаноўкі культпрацы ў буйных калгасах. Гэта неадкладная задача, бо культасьветная праца ў буйных калгасах пастаўлена надзвычайна дрэнна, ёю фактычна ніхто сур'ёзна не займаўся. У сучасны момант мяркуецца пры кожным акркалгассаюзе мець спэцыяльных культпрацаўнікоў, якія разам з органамі Наркамасьветы будуць займацца наладжваньнем культпрацы.

Кінаабслугоўваньне калгасьнікаў ... ня. Сетка кінаперасовак Белкаапсаюзу павінна ў першую чаргу абслугоўваць калгасьнікаў, між тым органы Белкаапсаюзу ставячы перад сабою мэты камэрцыйныя, вельмі рэдка пасылаюць кінаперасоўкі ў калгасы. З гэтым раз назаўсёды трэба пакончыць. Трэба, каб кінаперасоўкі ня менш аднаго разу ў месяц былі ў калгасах. Радыёфікацыя калгасаў значна пасунулася ўперад, адпак яшчэ недастаткова. Трэба і на гэту галіну працы зьвярнуць належную ўвагу.

У справе наладжваньня культпрацы ў калгасах павінны дапамагчы шэфскія арганізацыі. Іх праца павінна быць накіравана на ўсямернае разьвіцьцё культурна-бытавых устаноў у калгасах.

Ад органаў Наркамздраву таксама патрабуецца прыстасаваньня свае працы да абслугоўваньня ў першую чаргу калгасьнікаў.

Трэба адзначыць, што зруху ў гэтых адносінах мы ня маем. Наркамздраў і яго органы на мясцох разгортваюць працу па абслугоўваньню „сялянства" наогул, што, рэч ведама, недапушчальна.

ПАВЯЛІЧЫМ КОЛЬКАСЬЦЬ І МАГУТНАСЬЦЬ ТРАКТАРАЎ І УТВОРЫМ МОЦНУЮ БАЗУ ДЛЯ БУЙНАЙ КАЛЕКТЫЎНАЙ ГАСПАДАРКІ.

КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ НА ПОЛАЧЧЫНЕ.

(Ад нашага полацкага карэспандэнта).

Растуць калгасы, з году ў год мацнее вёска, паляпшаецца сялянскае жыцьцё. Калі на 1 кастрычніка 1928 г. на Полаччыне было 74 калгасы, якія налічвалі: 9.213 гэкт. зямлі, 1447 членаў, 687 двароў, альбо 3.462 едакі, дык зараз справа далёка рушылася ўперад.

Стварэньне сельска-гаспадарчых арцеляй таксама пайшло наперад. На 15-6-29 г. мы ўжо маем дзевяць с.-г. камун на плошчы 1.383 гэкт.; 116 сельгасарцеляй на плошчы 14.438 гэкт. Таварыстваў па супольнай апрацоўцы налічваецца 8 на плошчы зямлі 733 гэкт. Усяго налічваецца (ня лічачы асеньняй кампаніі) на сёньнешні дзень 133 калгасы на агульнай плошчы 16.554 гэкт. зямлі, пры 2.860 сябрах, 1.408 двароў; з гэтага ліку: 895 беднякоў, 496 серадпякоў і 16 заможнікаў. Памянёныя калгасы ўсяго налічваюць 6.778 едакоў.

Пералічаныя лічбы яскрава кажуць аб тым, што справа калектывізацыі на Полаччыне парушылася. Бядняцка-серадняцкая частка пачынае разумець вялікую карысьць калектыўнага жыцьця.

У час веснавой пасеўкампаніі ў трох сельсаветах нашае акругі на гаспадарчых плянах праводзілася стопроцантнае вытворчае кааперыраваньне. Правядзеньне такога кааперыраваньня патрэбна было для вопыту ў далейшай працы. Трэба адразу сказаць, што вопыт удаўся. Пляны па вытворчаму кааперыраваньню выкананы на 60 проц. па ўсіх сельсаветах. Кулацка-заможная частка вёскі імкнулася перашкодзіць у гэтай працы, ... беднату ў саюзе з серадпякамі зразумелі вялікую карысьць вытворчага кааперыраваньня.

Зараз маецца 345 вытворчых сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў, якія налічваюць 9202 сябры, з гэтага ліку 3406 беднякоў і 5596 серадпякоў.

Нельга не сказаць пра калгаснае будаўніцтва сярод пацменьшасьцяў. Тут таксама, побач з недахопамі, маюцца дасягненьні. Яўрэйскія калгасы „Орт" (Полацкі райён) „Акцябр" (Валынецкі райён), „Інтэрнацыянал" (Ветрыншчына) на вачох усяго насельніцтва растуць і ўзмацняюцца. Гэтыя калгасы яскрава паказалі ўсяму сялянству, што працоўныя яўрэі (якім раней нельга было займацца земляробствам) пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі могуць будаваць новае жыцьцё на агульнай зямлі. Апрача гэтага калгас імя Дзяржынскага ў Валынецкім райёне (выключна з палякаў) дасягнуў вялікіх посьпехаў у сваёй штодзённай працы. Вось чаму ў гэты калгас наладжваюцца экскурсіі.

Як-жа ідзе бядняцка-серадняцкая частка ў калгасы? На гэтае, вельмі важнае запытаньне, адкажам фактамі. Сяляне в. Залужэньне, Усайскага сельсавету, Вульскага райёну, на сваім агульным сходзе пасьля дакладу аб калектывізацыі пастанавілі: „уступіць усёй вёскай у калгас і выклікаць на гэта суседнія вёскі Усая і Хадакава". Сяляне вёскі Чырвонцы, Асьвейскага райёну, у адказ на бандыцкія вылазкі кітайскіх мілітарыстаў арганіза... таў", куды адразу ўступіла 13 гаспадароў.

Зараз вядзецца праца па арганізацыі калгасу ў в. Шайтрава, Валынецкага райёну. Проста кажучы, тут маецца калгас „Верны Шлях", але ён будзе пашыраны.

Некалькі вакольных вёсак згадзіліся пайсьці ў калгас, які будзе створан прыблізна на 1000 гэкт. зямлі, з 400-450 асоб, галоўным чынам, беднякоў і серадпякоў. Стварэньне такога буйнага калгасу мае велізарнае значэньне. Вось чаму сюды трэба перакінуць вялікія сілы і сродкі вытворчасьці. Праўда, ёсьць яшчэ выпадкі, калі несьвядома сяляне згаджаюцца, што „калгас вельмі добрая справа, усё гэта правільна, але я пачакаю, хай у калгас ідуць другія". Але гэта толькі выпадкі.

Пару слоў пра вялікія Наўліцкія балоты, якія ляжаць на плошчы каля 10000 гэктараў. Раней гаспадарамі гэтых балот былі ваўкі, раней там рос мох, нельга было прайсьці, а зараз на гэтых балотах створана вялікая чырвонаармейская камуна імя №-скай дывізіі. Памянёная камуна атрымала ад дзяржавы 32000 руб. безваротнага крэдыту. Яна налічвае каля 40 дэмабілізаваных байцоў, будуе дамы, закупляе машыны, праводзіць меліярацыю. Стварэньне такой паказальнай камуны набывае асаблівую важнасьць. Чырвоныя байцы, пры дапамозе акруговых органаў і вайсковых частак, на агульнай зямлі будуюць агульную справу. Яны пераможуць.

ПРЫВІТАНЬНЕ АД ЦВК І СНК БССР 3-му НАДЗВЫЧАЙНАМУ ТАДЖЫКІСТАНСКАМУ ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ.

ДЗЮШАМБЭ, СТАРШЫНІ ЦВК ТАДЖЫКІСТАНУ.

К вялікаму жалю, ня маючы магчымасьці прыняць удзел у зьезьдзе, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР ад імя працоўных Савецкай Беларусі горача вітае працоўных Таджыкістану ў асобе яго Трэцяга Надзвычайнага Зьезду Саветаў. Працоўныя Беларусі ўпэўнены, што ваш Зьезд на асновах салідарнасьці ўсіх народаў Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі правільна вырашыць усе пастаўленыя пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва Савецкага Таджыкістану.

Ч. в. аб. Старшыні ЦВК БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Старшыня СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.

За сакратара ЦВК БССР У. ІГНАТОЎСКІ.

Сэнс перамоў Макданальда з Гувэрам.

У чым сэнс салодкіх слоў, дзе фігуруе бог і вера поруч з такімі „нематэр'яльнымі“ рэчамі, як крэйсэры, надводныя лодкі і г. д., той самай прамовы і дэклярацыі Макданальда з Гувэрам і таго аглушаючага шуму, які ўзьнят навакол гэтага спатканьня ў сусьветным буржуазным друку? Адказ на гэтыя запытаньні хаваецца ў значным абвастрэньні англа-амэрыканскага выпярэдніцтва, якое зьяўляецца галоўнаю супярэчнасьцю ў лягеры імпэрыялістычнай буржуазеі.

Сапраўдны стан рэчаў такі. Пад напорам Амэрыкі Англія імкнецца адстаяць найбольш спрыяючыя пры даных умовах пазіцыі, згаджаючыся на часовае зьмякчэньне вострасьці барацьбы. Гісторыя міжнародных адносін ведае не адзін факт, калі краіны, якія ішлі да няўхільнай вайны, займаліся „мірнымі“ дэклярацыямі, імення затым, што яны ішлі да вайны.

„Нічога ня было зазначана,—піша „Таймс“,—наконт англа-амэрыканскай Антанты, бо містэр Макданальд ведае гэтак сама добра, як і містэр Гувэр, што Злучаныя Штаты ня хочуць і ня могуць уступаць у Антанту, ці ў альянс з якой небудзь дзяржавай... Прычына, чаму Амэрыка „ня хоча і ня можа“,—зусім ясная.

Вялізныя капіталы, накопленыя Амэрыкай, шукаюць выхаду. Напярэдадні 1914 году ўклады амэрыканскіх капіталістаў заграніцаю дасягалі 2,5 міліярдаў даляраў, а зараз—27 міліярдаў, прычым, штогодны іх рост складае 2 міліярды. Вытворчыя магчымасьці Амэрыкі перавышаюць 25 проц. патрэбы нацыянальнага рынку. Загэтым у Канадзе, у Лацінскай Амэрыцы, Індыі, Кітаі, Аўстраліі і нават у самай Эўропе—усюды стыкаюцца ў невырашанай супярэчнасьці інтарэсы Злучаных Штатаў і Англіі.

Ангельская гандлёвая місія на чале з лёрдам Д'Абэрнонам прыехала ў Аргентыну з мэтаю „выкарыстаць напружаныя адносіны“ між Злучанымі Штатамі і Аргентынай. Аб становішчы на Ціхім Акіяне і гаварыць не даводзіцца, яно добра ілюструецца заяваю амэрыканскай часопісі ў Шанхаі „Чайна Уіклі Рэв'ю“, што адносіны Злучаных Штатаў і Англіі на Далёкім Усходзе „былі нездавальняючымі на працягу значнага пэрыяду, але цяпер робяцца яшчэ горшымі“. З драпежнасьцю пазірае „брытанскі леў“ і на тое, як няўхільна расьце тавараабарот Злучаных Штатаў „з жамчужынай брытанскай кароны“—Індыяй, як амэрыканцы будуюць у Пэрсіі „разам з нямецкім капіталам“ чыгунку, як навадняецца Кітай амэрыканскімі дарадчыкамі і як шчупальцы амэрыканскага імпэрыялізму падбіраюцца, шляхам заляцаньняў да Эгіпту, да вузлавой крываноснай артэрыі Брытаніі—Суэцкаму каналу. Панама і Сінгапур—два стратэгічных вузлы англа-амэрыканскай барацьбы на Ціхім акіяне. З другога боку, Злучаныя Штаты вядуць рашучы наступ супроць Англіі і на фронце эўрапэйскім, дзе з 27 міліярдаў даляраў доўгу эўрапэйскіх дзяржаў Амэрыка спагнала пакульшто 17 міліярдаў. Наступ Амэрыкі тут выяўляецца і ў барацьбе на грашовым рынку. Банкіры Сіці, улічыўшы пагрознае павышэньне „тэмпэратуры“ англа-амэрыканскіх адносін, паслалі Макданальда паспрабаваць шчасьця за акіянам наконт часовага зьмякчэньня супярэчнасьцяў. Пры гэтым яны спадзяваліся на даволі ўжо даказаную здольнасьць „рабочага“ ўраду ня горш, чымся гэта рабілі самі кансэрватары, нават лепш, адстаіваць імпэрыялістычныя інтарэсы Англіі.

Адгэтуль нарадзілася супольная дэклярацыя Макданальда-Гувэра. Пад салодкімі пацыфісцкімі словамі хаваецца ні што інакшае, як спроба ўтаіць шалёны тэмп узброеньня і падрыхтоўку да будучай вайны між Амэрыкай і Англіяй. Так, напрыклад, дэклярацыя заявае, што Макданальд і Гувэр дамовіліся аб «марскім парытэце», гэта значыць аб роўнасьці марскіх сіл. Англія павінна, згодна гэтага ўгавору, здаць на злом 20 крэйсэраў. Але сакрэт у тым, што 17 з іх застарэлыя і замест іх Англія будавацьме 7 новых крэйсэраў з вадазьмесцам у 40 т. тон.

Такім зьяўляецца сапраўдны твар англа-амэрыканскага „разброеньня“. Што-ж датычыць зьнішчэньня падводнага флёту, дык верхам наіўнасьці было-б думаць, што Японія, Францыя і Італія згодзяцца на гэтае мерапрыемства, якое закранае самыя блізкія інтарэсы гэтых больш дробных акул імпэрыялізму. Дэклярацыя зусім невыпадкова гаворыць аб надыходзячай марской канфэрэнцыі 5 дзяржаў: (Амэрыкі, Англіі, Японіі, Францыі і Італіі). „Разбройваючы“ апэтыт, як відаць, нагэтулькі ўзрост і ў іншых трох дзяржаў, што ніводная з іх не згаджаецца на ўхваленыя вашынгтонскай канфэрэнцыяй (1921-1922 г.) прапорцыі закрытых суднаў. Усе яны патрабуюць павялічэньня ліку іх крэйсэраў і падводных лодак.

Сапраўды, вайна, як зазначае дэклярацыя Макданальда-Гувэра, робіцца «нячуванай». Шаноўныя асобы з дзяржаўнай службы, аднак, шмат пра што зусім не ўпамянулі ў дэклярацыі. У прыватнасьці, яны замоўчалі такія „дробязі“, як „свабода мораў“, даўгі, мытная палітыка, Ліга Нацый, гаагскі трыбунал і г. д. і г. д. Гэта значыць, што гэтыя асноўныя аб'екты супярэчнасьцяў між Англіяй і Амэрыкай будуць абвастрацца ў бліжэйшы час з большай сілай.

Зусім правільна заяўляе часопісь „Форэйн-Офэрс“: „ці ўдасца папярэдзіць вайну, ці кожная вайна абернецца ў вайну англа-амэрыканскую». Англа-амэрыканскія супярэчнасьці будуць чым далей, тым больш разьвівацца на пашыранай базе.

Гэта—сучасная сапраўднасьць, якая сьвіціцца праз пацыфісцкую заслону перамоў Макданальда з Гувэрам.

„Праўда“.

Рашучы пратэст Саюзнага ўраду

Ад Народнага Камісарыяту Замежных Спраў.

МАСКВА, 12-Х. Народны камісарыят замежных спраў уручыў нямецкаму пасольству наступную заяву з просьбай перадаць яе нанкінскаму міністэрскаму ўраду:

Наперакор шматлікім папярэджаньням і пратэстам Саюзнага ўраду, выкладзеных у яго заявах ад 15 жніўня, 9 і 25 верасьня з прычыны няспыненьня абстрэлаў савецкай тэрыторыі і нападаў на гэту тэрыторыю з боку кітайскіх войск і арганізаваных кітайскімі ўладамі белагвардзейскіх банд, гэтыя напады і абстрэлы ня спыняюцца і да гэтага часу, носячы ўпарты і сыстэматычны характар у раёне ракі Амур і асабліва ля ўтоку ракі Сунгары.

Кітайскае войска, якое знаходзіцца ля ўтокі рэчкі Сунгары і на берагу ракі Амур з пачатку кастрычніка і па некалькі раз абстрэльвала мірнае насельніцтва, якое знаходзілася на савецкім баку ракі Амур, а таксама праходзячыя камэрцыйныя параходы і тым дэзарганізавала нармальныя зносіны па рацэ Амур.

За той-жа пэрыяд пачасьціліся выпадкі пераходу на нашу тэрыторыю белагвардзейскіх банд пры непасрэднай дапамозе кітайскага войска.

10-га кастрычніка былі заўважаны кітайскія плывучыя міны ў раёне Міхайлаўска-Сямёнаўскага ў непасрэднай блізасьці ад стаянкі савецкіх вартавых суднаў і толькі пільнасьць гэтых суднаў папярэдзіла катастрофу і дазволіла сваечасова зьнішчыць міны.

11-га кастрычніка савецкія вартавыя судны і вайсковая варта падпалі пад абстрэл з кітайскіх акопаў раёну утокі рэчкі Сунгары. Нарэшце, 12-га кастрычніка на расьсьвеце караван савецкіх камэрцыйных суднаў, які праходзіў па рацэ Амур каля рэчкі Сунгары, падпаў пад моцны кулямётны і артылерыйскі агонь з кітайскага берагу. У выніку некаторыя судны каравану былі пашкоджаны, а сярод экіпажу каравана маюцца раненыя і забітыя.

Судны савецкай ваеннай флётыліі, якія праваджалі караван, вымушаны былі распачаць адказны агонь па кітайскіх акопах і па кітайскіх ваенных суднах. Аднак, абстрэл з кітайскага боку спыніўся толькі пасьля таго, як наша флётылія і вайсковыя часьці ўжылі больш рашучыя меры, якімі прымусілі кітайскія і белагвардзейскія часьці спыніць абстрэл савецкіх суднаў і напады на мірнае насельніцтва зазначанага пагранічнага раёну.

Саюзны ўрад заяўляе рашучы пратэст супроць няспыненьня правакацыйных нападаў і абстрэлаў з боку кітайскага войска і белагвардзейскіх банд, якія арганізаваны і падтрымліваюцца першымі.

Саюзны ўрад заяўляе, што ён будзе ўжываць і ў далейшым усе неабходныя меры дзеля забясьпечаньня спакою на савецка-кітайскай граніцы і мірнае працы насельніцтва савецкіх пагранічных раёнаў.

Патрэбны рашучыя меры.

Пратэст працоўных Хабараўску.

ХАБАРАЎСК. Адбылася шматлікая дэманстрацыя пратэсту працоўных Хабараўску супроць наглай правакацыі вайны з боку нанкінскага і мукдэнскага ўрадаў, якіх пацкоўваюць імпэрыялістычныя дзяржавы. На мітынгу была ўхвалена рэзалюцыя, у якой зазначана:

„З кожным днём павялічваюцца абстрэлы кітайскімі і белагвардзейскімі бандамі нашага мірнага насельніцтва, узмацняецца суровы тэрор кітайскай ваеншчыны супроць савецкіх грамадзян. Кітайскія бандыты забылі ўрокі Санчагоу, Пагранічнай і Казакевічава. Усякай міралюбнасьці ёсьць мяжа. Мы патрабуем ад ўраду ўжыць самыя рашучыя і энэргічныя захады да спыненьня раз назаўсёды налётаў кітайскіх банд на нашу тэрыторыю.

* * *

ХАБАРАЎСК, 11-Х. 7 кастрычніка ў раёне Палія-Масьляны завод кітайскае войска пры ўдзеле расейскіх белагвардзейцаў захапіла плыты сплаўнога лесу, які прызначаўся для пабудовы казармы. Чырвонафлётцы і армейцы абураны гэтаю нагласьцю кітайцаў і белагвардзейцаў і патрабуюць адабраць назад захоплены лес і правучыць налётчыкаў.

Пачаліся стычкі паміж войскамі Чан-Кай-Шы і Фынь-Юй-Сяна.

ТОКІЁ, 11-Х. Нанкінскі ўрад выдаў загад аб арышце лідэраў „рэарганізацыяністаў“ Бо-Вэн-Вэя, Чэн-Гун-Бао і Ван-Фа-Чуна. 21 фынь-юй-сянаўскі генэрал на чале з Сун-Чжэ-Юанам агаласілі праклямацыю, у якой патрабуюць звароту з Эўропы «новага» лідэра Гаміндану Ван-Цьзін-Вэя для супрацоўніцтва з Чан-Кай-Шы і перадачы Фынь-Юй-Сяну назад усіх яго ранейшых пасад. Праклямацыя нападае на бліжэйшых супрацоўнікаў Чан-Кай-Шы.

Водлуг паведамленьня Сімбун Рэнго з Пэйпіну, Ен-Сі-Шан агаласіў заяву, у якой падкрэсьлівае, што нацыянальны лёс Кітаю павінен быць вырашан „публічным абмеркаваньнем пры ўдзеле ўсёй масы“. Думаюць, што Ен-Сі-Шан мае гэтым на ўвазе склік нацыянальнага збору і што яго патрабаваньне інсьпіравана Анфуісцкай групай (групай японафілаў). Сімбун Рэнго паведамляе з Нанкіну, што Чан-Кай-Шы загадаў Хо-Чжэн-Чжэну (ранейшы старшыня хубэйскага правінцыйнага ўраду) выехаць з Пэйпіну ў Тайюань (правінцыя Шансі) з мэтаю пераканаць Ен-Сі-Шана захаваць нэйтралітэт у барацьбе між Чан-Кай-Шы і Фынь-Юй-Сянам.

Водлуг неправераных вестак, стычка між войскам Чан-Кай-Шы і Фынь-Юй-Сяна ўжо распачалася на мяжы між правінцыямі Хубэй і Шансі.

* * *

ТОКІЁ, 11-Х. Як паведамляе агенцтва Сімбун Рэнго з Пэйпіну, Фынь-Юй-Сян зьвярнуўся да Ен-Сі-Шана з вялікім маніфэстам, накіраваным супроць Чан-Кай-Шы і нанкінскага ўраду.

Пад сьцягам Камінтэрну.

Кампартыя Злучаных Штатаў рашуча асуджае правых.

НЬЮ-ЁРК, 12-Х. Пленум цэнтральнага камітэту камуністычнай партыі Злучаных Штатаў паслаў Выканкому Камінтэрну тэлеграму, у якой зазначана: «Першы пленум ЦК, які сабраўся пасьля дасягнутай пры дапамозе Выканкому Камінтэрну ліквідацыі фракцыйнай барацьбы, аднагалосна вітае Выканком Камінтэрну, абавязуецца напружыць усе сілы для ліквідацыі рэнэгатаў правага крыла, для барацьбы супроць прымірэнцаў і для заваёвы кіраўніцтва большасьцю амэрыканскага пралетарыяту. Пленум ЦК далей заяўляе, што ён цьвёрда стаіць на пункце гледжаньня пастаноў 6-га сусьветнага кангрэсу і Х пленуму Камінтэрну.

„Апартуністы“ падвялі Чан-Кай-Шы.

ШАНХАЙ, 11-Х. У сувязі з 11-мі ўгодкамі заснаваньня кітайскай рэспублікі Чан-Кай-Шы агаласіў заяву, у якой востра ганьбіць „апартуністаў, якія вядуць краіну да пагібелі з-за сваіх уласных палітычных выгад“. Водлуг слоў Чан-Кай-Шы, савецка-кітайскі канфлікт і паўстаньні па поўдні ня былі-б для нанкінскага ўраду цяжкімі праблемамі, калі-б ня „зьнікненьне добрых якасьцяў кітайскай сумленнасьці і разуменьня адказнасьці“.

Чан-Кай-Шы падчышчае нанкінскі ўрад.

ТОКІЁ, 11-Х. Агенцтва Сімбун Рэнго паведамляе: „Чан-Кай-Шы аддаў загад аб арышце ўсіх прыхільнікаў Фынь-Юй-Сяна. Адначасна агалошана паведамленьне аб звальненьні з пасады нанкінскага вайсковага міністра Лу-Чу-Ліна і іншых прыхільнікаў Фынь-Юй-Сяна. Войска Фынь-Юй-Сяна выступіла ў напрамку да мяжы між Шансі і Хубеем“.

Загад Нанкіну аб арышце прыхільнікаў Фына.

ШАНХАЙ, 11-Х. Нанкінскі ўрад выдаў некалькі загадаў, накіраваных супроць Фынь-Юй-Сяна. Згодна спэцыяльнага загаду звольнены і падлягаюць арышту прыхільнікі Фына: вайсковы міністр Лу-Чун-Лін, сябра вайсковай рады, Лю-Чы, якія знаходзіліся ў Нанкіне, адкуль цяпер уцяклі. Адначасна выдадзен загад аб арышце некаторых левых гамінданаўцаў. Выдан абежнік, у якім зазначаецца, што карная экспэдыцыя супроць Фынь-Юй-Сяна будзе пазначана ў самым блізкім час. Ёсьць таксама весткі, што Фынь-Ен-Сі-Шан распачалі мабілізацыю свайго войска і што фынь-юй-сянаўскае войска захапіла ўжо Лёйян. Абодвы бакі робяць сьпешныя ваенныя перасоўваньні да Луньхайскай і Пекін-Цянцьзінскай чыгунак, а таксама уверх па рэчцы Янцзы, у напрамку да Ханькоу. Ваенныя апэрацыі між арміяй Фына і Нанкіна лічацца няўхільнымі.

Праца груп беднаты—важнейшая галіна партпрацы.

УСІМ АК І РК КП(б)Б.

Дарагія таварышы!

Адбыўшыся нядаўна верасьнёўскі пленум ЦК КП(б)Б падагуліў вынікі і *прыняў* адказнейшыя рашэньні па галоўнейшых пытаньнях далейшага сацыялістычнага будаўніцтва.

Выкананьне прынятых Пленумам рашэньняў, накіраваных на яшчэ большае разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва і рашучае выкарчоўваньне каранёў капіталізму, патрабуе ад усіх арганізацый і кожнага камуніста рашучага ўзмацненьня ўсёй працы на вёсцы і асабліва працы сярод беднаты.

Неабходнасьць самага рашучага паляпшэньня і ўзмацненьня працы сярод беднаты выклікаецца, па-першае —меўшымі, а часамі і зараз яшчэ маючымі мейсца выпадкамі скрыўленьня клясавай лініі ў працы зямельных, крэдытных, падатковых і іншых арганізацый і, па-другое, таму, што ў сувязі з масавым калгасным будаўніцтвам, які ўсе разгортваецца праводзімай зараз працай па хлебазагатоўках, далейшым нашым наступленьнем на кулака і г. д., яшчэ больш абвастраецца клясавая барацьба.

Усё гэта патрабуе далейшага рашучага ўзмацненьня барацьбы з кулацтвам і ўзмацненьня бядняцка-серадняцкага блёку, дзеля чаго работу партыйных арганізацый сярод беднаты трэба ўзьняць на нябывалую вышыню. Забясьпечыць правільнае правядзеньне клясавай лініі ва ўсёй рабоце ўсіх устаноў і арганізацый на вёсцы мы зможам толькі пры актыўным садзейнічаньні, шырокім кантролі і актыўным удзеле самой беднаты, як апоры рабочай клясы і партыі на вёсцы, у працы ўсіх савецкіх і грамадзкіх устаноў і арганізацый. Трэба самым рашучым парадкам весьці барацьбу з недаацэнкай рашаючага значэньня работы сярод беднаты, як з праявамі яўна права-апартуністычнага ўхілу.

Выходзячы з таго, што праца сярод беднаты пастаўлена надта слаба, што на працягу летняга часу амаль ніякай не праводзілася работы,—асеньні і надыходзячы зімовы час трэба шырока выкарыстаць для праверкі ўсёй работы сярод беднаты і самага рашучага ўзмацненьня яе.

Сакратарыят ЦК КП(б)Бел. 1 прапанаваў усім АК і РК для праверкі работы сярод беднаты і для масавага разгортваньня працы па ўзмацненьню работы ўсіх арганізацый на працягу кастрычніка і лістапада месяцаў сумесна правесьці раённыя нарады і акруговыя канфэрэнцыі груп беднаты з шырокай папярэдняй праверкай і інструктаваньнем груп беднаты на мясцох.

ЦК арыентыровачна раіць паставіць на абгаварэньне раённых нарад і акруговых канфэрэнцый груп беднаты наступныя пытаньні: 1) пяцігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі Саюзу і БССР з канкрэтным вызначэньнем задач для мясцовых арганізацый і ўстаноў і вызначэньнем задач і ролі груп беднаты, 2) пытаньні хлебазагатовак і задачы груп беднаты ў сувязі з давядзеньнем пляну хлебазагатовак да вёсак і да кулацкіх гаспадарак, 3) вынікі калектывізацыі і далейшыя задачы.

Улічваючы практыку правядзеньня раённых нарад і акруговых канфэрэнцый груп беднаты ў мінулым, неабходна забясьпечыць найбольш шырокі ўдзел усіх груп беднаты і батрацтва на раённых нарадах і імкнуцца давесьці лік удзельнікаў акруговых канфэрэнцый да 100-150 чалавек.

Найбольш шырока прыцягваць таксама ў працу раённых нарад практыкантаў—жанчын-бяднячак.

АК і РК КП(б)Б неабходна стала і сваечасова падрыхтаваць нарады і канфэрэнцыі груп беднаты з тым, каб у выніку масавай такой праверкі ўся работа сярод беднаты і ў прыватнасьці работа груп беднаты рашуча была палепшана.

Акругкомы павінны забясьпечыць сваімі прадстаўнікамі ўсе раённыя нарады груп беднаты, па правядзеньню каторых вынікі патрэбна абгаварыць у РК і АК КП(б)Б.

Ход падрыхтоўкі і вынікі нарад-канфэрэнцый неабходна шырока асьвятляць на старонках газэт.

Аб тэрмінах скліканьня акруговых канфэрэнцый просьба паведаміць ЦК.

Сакратар ЦК КП(б)Б **Гамарнік.**

Заг. аддзелу ЦК па працы ў вёсцы **Міцькоў.**

У Саюзе ССР.

Прывітаньне ЦК УсеКП рабочым „Красного Путиловца“.

Дырэкцыі, завкому і калектыву УсеКП(б) „Красного Путиловца“ Праўленьню ленінградзкага машынатрэсту.

ЦК УсеКП(б) з вялікім здаволеньнем адзначае факт выкананьня „Красным Путиловцем“ гадавога заданьня—3.000 трактараў. Гэта адзін з лепшых каменьняў у падмурку вытворчай змычкі пралетарыяту з шырокімі масамі сялянства. ЦК выказвае цьвёрдую ўпэўненасьць, што заданьне гэтага году па 10.000 новых чырвонапуцілаўскіх трактараў будзе выканана з такім самым посьпехам. Гэтыя трактары паскораць справу выкарчоўваньня капіталізму ў нашай краіне і ўздымуць бадзёрасьць сацыялістычных будаўнікоў у тысячах вёсак. Бальшавіцкае прывітаньне рабочым і работнікам, тэхнічнаму складу і кіруючым органам „Красного Путиловца“.

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Камуністычнай партыі (бальшавікоў).

Меркаваньні НКП аб падрыхтоўцы кваліфікаваных будаўнічых рабочых.

МАСКВА, 12-Х. Калегія НКПрацы разглядала пытаньне аб падрыхтоўцы кваліфікаваных будаўнічых рабочых. У 1929-30 годзе мяркуецца падрыхтаваць 120 тысяч будаўнікоў: па РСФСР—75 тысяч, Украіне—30 тысяч, Беларусі—5 тысяч, Закаўказьзю —5 тысяч, Узьбекістану—4 тысячы і па Туркменістану—1 тысяча рабочых. У першую чаргу будуць падрыхтаваны каменшчыкі-атынкоўшчыкі, цесьляры і бэтоншчыкі. Уся асноўная праца па падрыхтоўцы кваліфікаваных будаўнікоў будзе сканцэнтравана на курсах пры біржах працы. На падрыхтоўку кваліфікаваных будаўнікоў мяркуецца затраціць 22 міліёны рублёў.

НКПрацы СССР прапануе НКПрацы саюзных рэспублік распачаць арганізацыю курсаў па падвышэньні кваліфікацыі будаўнічых рабочых. Курсы павінны быць арганізаваны ва ўсіх буйных прамысловых цэнтрах і ў гарадох з шырока разгорнутым будаўніцтвам, а таксама ў сельскіх мясцовасьцях, дзе зімою жывуць будаўнічыя рабочыя. Курсы неабходна адчыніць неадкладна. Яны павінны распачаць сваю працу ў несэзонны пэрыяд (лістапад-сакавік). У 1929-30 г. праз курсы павінна быць прапушчана 20 тысяч будаўнікоў: па РСФСР—12 тысяч, Украіне—5 тысяч, Закаўказьзю—паўтары тысячы і па Беларусі, Туркменістану і Узьбекістану—па паўтысячы будаўнікоў. З гэтае колькасьці ў сельскіх мясцовасьцях павінны быць арганізаваны курсы на 3.600 будаўнікоў.

Першыя вынікі верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б.

Верасьнёўскі пленум нашага ЦК зусім правільна называецца пераломным імення таму, што гэты пленум, а за ім **уся** (імення ўся) партыйная арганізацыя ва ўсёй сваёй масе, з усёй сілай і рашучасьцю абрушыліся на правы ўхіл на практыцы, а таксама і на найбольш небясьпечны на даным этапе з усіх відаў шавінізму — на беларускі нацыянал-дэмакратызм. Найшырэйшая масавая самакрытыка, пераплеценая з выхаваўчымі і карнымі мерапрыемствамі партыі супроць скажэньняў лініі партыі, ахапляе **ўсе** вучасткі работы, усе зьвеньні нашых апаратаў. Масавая сьмелая самакрытыка выкрыла побач з прышчэпаўшчынай (аб прышчэпаўшчыне асабліва трэба гаварыць таму, што гэта цэлая сыстэма поглядаў і дзеяньняў, якія вядуць проста да капіталізму) цэлы рад недапушчальных скажэньняў генэральнай лініі партыі (у саматужна-прамысловай каапэрацыі, у Наркамасьвеце, Акадэміі Навук, навукова-дасьледчым інстытуце сельскае і лясное гаспадаркі і некаторых іншых арганізацыях і ўстановах). Гэта-ж масавая самакрытыка пачала выяўляць, **хто** імення з камуністых сьвядома скажае або няздольны праводзіць генэральную лінію партыі, **хто** з камуністых ідзе на павадку ў буржуазных ідэолёгаў, **хто** з беспартыйных сьвядома процістаўляе ў дзеяньні буржуазныя тэорыі генэральнай лініі партыі.

Называючы верасьнёўскі пленум ЦК пераломным, ці лічым мы, што да верасьнёўскага пленуму ў нас ня было самакрытыкі, ня было барацьбы з правым ухілам на практыцы, ня было барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам? Зразумела, не. Але да верасьнёўскага пленуму гэта барацьба вялася з **невыстарчальнай** сілай.

Пасьля верасьнёўскага пленуму мінуў месяц. Мы зрабілі рад добрых спраў. Разгарнулі барацьбу з прышчэпаўшчынай, арганізавалі барацьбу са скажэньнямі ў саматужна-прамысловай каапэрацыі, Наркамасьветы, Акадэміі Навук, фінансавым апараце і радзе іншых месц. Некаторых з безнадзейных на чале з Прышчэпавым выключылі з партыі, рад членаў партыі, слаба па-бальшавіцку загартаваных, якія зрабілі апартуністычныя памылкі, зьнялі з тэй работы, дзе патрэбна, ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, цьвёрдая бальшавіцкая загартаванасьць і цьвёрдая клясавая лінія. Зьняты з адказнае работы і некаторыя „беспартыйныя“, якія „выпусьцілі з-пад увагі“, што мы будуем сацыялістычную гаспадарку і ніяк ня хочам ісьці назад да капіталізму, а ідзем шпаркімі крокамі наперад да сацыялізму. Гэтыя „спэцы“ падбадзёраныя супраціўленьнем сацыялістычнаму будаўніцтву вясковага кулака і гарадзкога нэпмана, зьяўляючыся іх ідэолёгамі, забыліся, што дыктатура пралетарыяту моцная і ўмацоўваецца, і што тыя, хто не захоча працаваць над ажыцьцяўленьнем пляну сацыялістычнага будаўніцтва, а паспрабуе падмяніць сутнасьць гэтага пляну капіталістычным зьместам, хутка скруцяць сабе шыю.

Але генэральная бойка, якую верасьнёўскі пленум ЦК і ўся арганізацыя далі праваму ўхілу ў ідэалёгіі і на практыцы і беларускаму нацыянал-дэмакратызму, зьяўляецца толькі **першым этапам барацьбы, што разгортваецца на гэтым фронце.**

У гэтай барацьбе асноўнай задачай зьяўляецца ня даць магчымасьці праціўніку адступіць і сабрацца з сіламі, трэба і далей бязьлітасна біць і дабіць яго. „Зьвязда“, якая заўсёды стаяла на варце лініі партыі, якая рашуча разгарнула правядзеньне ў жыцьцё пастаноў верасьнёўскага пленуму ЦК, павінна, закасаўшы рукавы, ня спыняючыся, працягваць барацьбу за генэральную лінію партыі. Дзе-ні-дзе ў нас чутны крыкі—„беларусаў б'юць“; характэрна, што пра тое-ж гавораць віленскі фашысцкі і нацыянал-фашысцкі друк. Гэта голас клясавага ворага. Пад агонь папалі і нападуць яшчэ некаторыя беларусы, расійцы, яўрэі, палякі і іншыя, але не для прапорцыі і роўнавагі, а па ступені віны ў скажэньні лініі партыі і палітыкі савецкай улады. Некаторыя працаўнікі-беларусы папалі пад **мацнейшы** агонь таму, што партыя паставіла іх на **адказнейшыя** вучасткі сацыялістычнага будаўніцтва, яны-ж давер'я партыі на гэтых пастох не апраўдалі. Трэба асабліва падкрэсьліць, што і да верасьнёўскага пленуму і зараз **памылкі** асобных таварышоў тэй ці іншай нацыянальнасьці асабліва па лініі нацыянальнага пытаньня **не сустракаюць безадкладнага, неабходнага і належнага адпору, у першую чаргу з боку таварышоў тэй-жа нацыянальнасьці.** Няма яшчэ такога палажэньня, каб, калі, дапусьцім, памыляецца ў нацпытаньні беларус, зараз-жа супроць гэтай памылкі масава выступілі перш за ўсё беларусы-ж. **Трэба-ж змагацца з гэтай недапушчальнай зьявай.** Менш будзе памылак, выхаваўчая работа па бальшавізацыі кадраў будзе мець непараўнальна большы размах і вынікі, калі будуць ліквідаваны гэтыя на справе часамі прымірэнчыя адносіны паасобных беларускіх таварышоў да памылак беларусаў, яўрэйскіх—да памылак яўрэяў і г. д.

Сьмешна думаць, што прышчэпаўшчыну, скажэньне лініі партыі ў саматужна-прамысловай каапэрацыі Наркамасьветы, Акадэміі Навук, фінансавым апараце, дасьледчых і іншых установах і арганізацыях мы ўжо ліквідавалі. Таксама будзе вельмі грубай памылкай лічыць, што пасьля выключэньня некаторых з партыі і зьняцьця з работы мы маем на ўсіх вучастках ужо такі падбор кадраў, які поўнасьцю забясьпечвае як рашучую барацьбу з правым ухілам і беларускім нацыянал-дэмакратызмам і ўсякімі іншымі шавінізмамі, так і правядзеньне генэральнай лініі партыі.

Будзе непапраўнай памылкай пераацэньваць дасягнутыя вынікі. **Непараўнаўча больш трэба зрабіць, як зроблена да гэтага часу.** У барацьбе з усякага роду ўхіламі, барацьба з правым ухілам на практыцы і прымірэнчымі адносінамі да яго дагэтуль застаецца галоўнай задачай. Барацьба з беларускім нацыянал-дэмакратызмам і прымірэнчымі да яго адносінамі ў сучасных умовах набывае асаблівае значэньне ў сувязі з тым, што ў гэтым гаспадарчым годзе будзе далейшае абвастрэньне клясавай барацьбы ў вёсцы і горадзе. Хлебазагатоўчыя пляны, даведзеныя ў гэтым годзе да кулацкага двара, узмоцненае разьвіцьцё новых калгасаў, значны рост у параўнаньні з мінулым годам індывідуальнага абкладаньня кулацтва—усе гэтыя фактары ня могуць ня выклікаць актывізацыі кулацтва і абвастрэньня яго барацьбы супроць мерапрыемстваў партыі і савецкай улады. Пашырэньне каапэрацыйнага абслугоўваньня насельніцтва ў гарадох будзе яшчэ больш выцясьняць прыватны гандаль. Выцясьняемыя з тавараабароту капіталістычныя элемэнты абвострац累 барацьбу супроць пралетарскае дзяржавы. Гэтыя акалічнасьці будуць зьяўляцца харчовым асяродзішчам для актывізацыі шавінізмаў, для беларускага нацыянал-дэмакратызму. З другога боку, афармленьне нацыянал-фашызму ў Заходняй Беларусі, які, зьяўляючыся палітычным выказьнікам інтарэсаў беларускай буржуазіі, кулацтва і буржуазнай інтэлігенцыі, уваходзіць састаўной часткаю ў антысавецкі контр-рэвалюцыйны лягер і выканае пляны польскага фашызму ў Зах. Беларусі, стымулюе атакі беларускіх нацыянал-дэмакратаў на дыктатуру пралетарыяту ў Савецкай Беларусі, таксама як вылазкі нац-дэмакратаў у нас акрыляюць нацыянал-фашыстых у Зах. Беларусі.

Узмоцненая пераклічка нацыянал-дэмакратаў Заходняй і Савецкай Беларусі пачалася ўжо. Маюць месца выпадкі, калі белагвардзейцы з Заходняй Беларусі друкуюць свае творы ў нас пры дапамозе нашых установаў. Работы некаторых нашых нацыянал-дэмакратаў настолькі адказваюць патрэбам польскага фашызму, што іх свабодна, без заўваг, друкуюць фашысцкія і нацыянал-фашысцкія друкаваныя органы ў Польшчы, а гэтыя людзі часта нават знаходзяцца ў нас на адказнай савецкай рабоце. Узмацнілася ўзаемная пахвальная рэцэнзія падобных друкаваных прац. Калі правым ухілістым і нацыянал-дэмакратам паказваюць іх месца, адзёргваюць іх, фашысцкі і нацыянал-фашысцкі друк называюць гэта „прасьледваньнем беларусаў маскалямі», людзей-жа, якія скажаюць лінію партыі, рэклямуюць, як гэрояў. **У гэтай абстаноўцы задача біць з усёй сілай па беларускім нацыянал-дэмакратызме зьяўляецца важнейшай і актуальнейшай задачай.**

Больш глыбокае вывучэньне і прапрацоўка пастаноў верасьнёўскага пленуму ЦК усёй партыйнай арганізацыяй, рашучае і бясспрэчнае правядзеньне іх у жыцьцё на падставе далейшага разгортваньня самай шырокай самакрытыкі яшчэ больш павінна актывізаваць партыйнай арганізацыі для бязьлітаснай барацьбы з правым ухілам на практыцы, беларускім нацыянал-дэмакратызмам і прымірэнчымі да іх адносінамі.

Энэргічнае правядзеньне ў жыцьцё пастаноў верасьнёўскага пленуму ЦК патрабуе **масавага ўцягненьня новых пралетарскіх кадраў** у кіраўніцтва сацыялістычным будаўніцтвам для забясьпечаньня выразнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі. ЦК ужо вызначыў сыстэму мерапрыемстваў па вылучэньні і падрыхтоўцы новых кадраў. Задача падбору, выхаваньня і падрыхтоўкі іх—**самая тэрміновая і самая важная задача ўсіх ячэек, партыйных камітэтаў, усёй партыйнай арганізацыі.**

Правядзеньне генэральнай лініі партыі абумоўлівае ў галіне культурнай работы неабходнасьць мабілізацыі шырокіх мас працоўнай інтэлігенцыі для выкананьня культурнае пяцігодкі. Нездавальняючасьць работы з шырокімі масамі працоўнай інтэлігенцыі за кошт лішняй вазьні з невялікай верхавінкай інтэлігенцыі патрабуе карэннае зьмены практыкі партыйнай, прафэсыянальнай і савецкай работы на гэтым вучастку.

Будзем весьці жорсткую барацьбу за генэральную лінію партыі, будзем бязьлітасна змагацца з правым ухілам на практыцы, беларускім нацыянал-дэмакратызмам, найбольш небясьпечным праяўленьнем нацыянальнага шавінізму на даным этапе, і прымірэнчымі да іх адносінамі—і ў вогнішчы гэтай барацьбы будзем выхоўваць і бальшавізаваць нашы кадры.

Я. ВАСІЛЕВІЧ.

Што гавораць аб савгасе „Гигант“ замежныя таварышы.

МАСКВА, 12-Х. Старшыня саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых Нарвэгіі т. Эдыгер, які наведаў нядаўна СССР, прыслаў у ЦК саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых СССР ліст, у якім ён піша: „Наведаньне савгасу „Гигант“ на Паўночным Каўказе зрабіла на мяне надзвычайнае ні з чым не параўнальнае ўражаньне. Я быў у савгасе ў часе збору ўраджаю. На полі працавалі разнародныя масы рабочых. Спэцыялісты і кіраўнікі работ яшчэ ня зусім асвоіліся з сваёю роляю. Аднак, збор ураджаю праходзіў без пераболу. Гэта сьведчыць аб правільнасьці пабудаваньня ўсёй сыстэмы працы ў савгасе „Гигант“. „Гигант“ — праграма рэвалюцыйнага наступленьня ў сельскай гаспадарцы. «Гигант»—твар сацыялістычнай сельскай гаспадаркі ў будучым. І з гэтае прычыны савгас „Гигант“ мае выключнае значэньне ня толькі для СССР, але і для ўсіх нас, зарубежных сельска-гаспадарчых рабочых. На „Гиганте“ будзем вучыцца будаваць сельскую гаспадарку на новых сацыялістычных асновах“.

Весткі адусюль.

Прычыны арышту 58 мэталёўцаў.

Арышт выклікаў вялікае абурэньне рабочых.

ВАРШАВА, 12-Х. Учарашні арышт 58-мі ўдзельнікаў дэлегацкага сходу варшаўскіх мэталёўцаў учынен з мэтаю зрыву падрыхтовак да забастоўкі варшаўскай мэталёпрамысловасьці. Паведамленьне аб арышце выклікала сярод рабочых вялікае абурэньне. Мэталёўцы неадкладна сабралі грошы для набыцьця харчу для арыштаваных. Рабочыя, якія зьявіліся з перадачамі ў паліцэйскую ўправу, былі затрыманы. Затрыманы таксама сваякі арыштаваных. Сёньня частка арыштаваных вызвалена. У сувязі з гэтай вылазкай улады забастовачныя настроі ўзмацніліся.

Барацьба за Кабул.

ТЭРМЭЗ, 8-Х. У Кабуле ня спыняецца асада цытадэлі: частка кугістанцаў вышла на поўнач Кугістану. Бача-Сакао з часткаю свайго войска застаецца ў Арке, змагаючыся супроць ворагаў.

ТЭРМЭЗ, 11-Х. Водлуг атрыманых тут вестак, учора ў Кабуле чакаўся Надыр-хан.

Амэрыка згодна ўдзельнічаць.

НЬЮ-ЁРК, 11-Х. Водлуг паведамленьня з Вашынгтону, урад Злучаных Штатаў у адказ на запросіны Англіі выказаў афіцыйную згоду ўзяць удзел у марской канфэрэнцыі 5 дзяржаў.

Наша задача сёньнешняга дню—пераход да грамадзкай апрацоўкі зямлі, пераход да буйнае аграмаджанае гаспадаркі.

ЛЕНІН.

Усебеларускі зьезд сельска-гасп. кааперацыі.

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ Т. ДУБІНЫ.

НА ШТО СЕЛЬСАЮЗ НЕ ЗВАРАЧВАЎ УВАГІ.

Прадстаўнік „Льноцэнтра" т. Радзівілін унёс на абмеркаваньне зьезду два ваступных практычных мерапрыёмствы.

БССР штогод мае мільён пудоў валакна лёну і пянькі і каля 2 мільёнаў пудоў алеёвага насеньня. Гэтая прадукцыя ў грашох выяўляецца ў суме 17 мільёнаў рублёў. Зусім слушна, што гэтыя даныя павінны стымуляваць утварэньне спэцыяльнага ільнасаюзу. Але, наколькі мясцовыя органы ўжо вырашылі пытаньне і ўтвараюць льнаводсаюз, дык „Льноцэнтр" прапануе арганізаваць пры гэтым саюзе асобны ільна-канапляводны аддзел з уласным балянсам, адпаведным агранамічна-інструктарскім пэрсаналам і з членам праўленьня саюзу на чале.

Да гэтага часу сувязь „Льноцэнтра" з беларускай кааперацыяй была часта толькі фармальнай. З бягучага апэрацыйнага году трэба зрабіць гэту сувязь больш шчыльнай і дзелавой.

Тав. Храпіўка адзначае, што сёлета сарвана справа вапназдабываньня. Арганізацыя сушкі гароднiны таксама кульгае.

Асабліва дрэнна з кантрактацыяй. Кантрактацыя ня цягне за сабою вытворчага каапераваньня. Заўважана шэраг выпадкаў скрыўленьня клясавай лініі пры праводзеньні кантрактацыі. Трэба перайсьці да суцэльнай кантрактацыі, пры якой бядняк павінен выконваць толькі аграмінімум.

Машынныя таварыствы растуць, як грыбы, але—ня маюць патрэбных машын.

Тав. Макарэнка. Белсельсаюз не зьвярнуў належнай увагі на садова-гародную справу якая займае апошняе месца ў рабоце Белсельсаюзу. На мясцох нічога ня робіцца, каб арганізаваць садова-гародныя таварыствы. Кулак займае вялікую ўдзельную вагу ў гэтай справе.

Тав. Макарэнка даводзіць, што сельска-гаспадарчая кааперацыя за 2 гады сабрала каля 2 мільёнаў рублёў капітал-накапленьня. Адкуль гэткія грошы? Зразумела, не ад здаровай работы, а ад вялікіх налічэньняў на збытавыя апэрацыі.

Трэба моцна ўдарыць па кулаку і заняцца належнай дапамогай беднаце і сацыялістычнаму сэктару.

Асабліва агіднае зьявішча наглядаецца з забясьпечаньнем машынамі. У вясну атрымліваюцца машыны, якія неабходны ўвосень, а ўвосень такія, у якіх адчуваецца патрэба ўвясну.

НЯМА КВАЛІФІКАВАНЫХ КААПЭРАТАРАЎ.

Тав. Матвееў спыняецца на пытаньні аб кадрах. Сельскай кааперацыі патрабуецца 500 аграномаў. Хто вінаваты ў тым, што іх няма? У першую чаргу—сама сельска-гаспадарчая кааперацыя. Белсельсаюз-жа бачыў, што Беларуская С.-Г. Акадэмія рыхтуе такіх спэцыялістаў, якія нам непатрэбны. А што ён рабіў, каб выправіць лінію акадэміі? Нічога.

Таксама адчуваецца ў нас вялікі недахоп у кваліфікаваных кааперататарах. Пакуль-што не прыняты захады да падрыхтоўкі новых працаўнікоў. Дырэктар Віцебскага кааперацыйнага тэхнікуму тав. Садоўскі меў рацыю, калі заявіў у сваім выступленьні, што мы не выкарыстоўваем існуючых магчымасьцяў. Наш кааперацыйны тэхнікум выпускае штогод ня больш 40 асоб, тым часам, як гэтыя вускі можна павялічыць да 80-100 асоб.

— Нам трэба стаць на шлях Наркамасьветы,—кажа далей т. Садоўскі,—які штогод падрыхтоўвае вялікія кадры асьветнікаў. Перабудова вёскі на сацыялістычны лад зьяўляецца справай ня менш важнай, чым увядзеньне ўсеагульнага навучаньня. Мы павінны дабіцца арганізацыі масавых кааперацыйных курсаў.

Былі таксама заўвагі з боку выступаўшых наконт недахопу спэцыялістаў па малочнай справе, па жывёлагадоўлі. У нас у раёнах мала зоотэхнікаў; трэба заняцца падрыхтоўкай спэцаў па малочнай гаспадарцы.

ПАКУЛЬ ШТО НЯ ТВАРАМ ДА КАЛГАСАЎ.

Тав. Воранаў закранае пытаньне абслугоўваньня калгасаў. Ці спраўляецца з гэтай задачай с.-г. кааперацыя? Прамоўца дае адмоўны адказ. Маса зьяўляецца тут застрэльшчыкам, а сельска-гаспадарчая кааперацыя пляцецца ў хвасьце.

Гэты самы таварыш прыводзіць шэраг фактаў, што крэдытныя таварыствы нядбайна адносяцца (магчыма, сумысьля) да запатрабаваньняў калгасаў. У той час, як калгас застаўся без угнаеньня, суседнія кулакі атрымліваюць значную колькасць фасфарытнай мукі.

Тав. Воранаў гаворыць далей аб тым, што трэба зьвярнуць належную ўвагу на падбор працаўнікоў у крэдытныя таварыствы. Такі працаўнік, які мае па некалькі кароў і моцную гаспадарку, пэўна, ня будзе агітаваць за калектывы, а працаўнікі нізоўкі павінны самі служыць прыкладам у гэтым.

З другога боку, трэба адразу дапамагаць калгасу з самага пачатку яго заснаваньня. Да гэтага часу наша сельска-гаспадарчая кааперацыя ня мае яшчэ пэўнай устаноўкі як у галіне арганізацыйнай, так і ў галіне матар'яльнай дапамогі калектывам.

ПАСТАРОМУ.

Бульбу капаюць рыдлёўкамі.

Тав. Ластоўскі—старшыня праўленьня Белсельбанку—спыніўся на пытаньні зьбіраньня сродкаў—паёў і ўкладаў. У гэтай галіне ў нас пакуль-што мала зроблена. Пляны па ўцягваньню сродкаў за мінулы год выканалі толькі на 50-60 пр.; а спагнаньнем плацяжоў справа таксама абстаіць нездавальняюча.

С.-Г. КААПЭРАЦЫЯ НЯ ЎЦЯГНУТА Ў САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА.

Ад ЦК КП(б)Б выступіў з прамовай тав. Гантман, які паміж іншым спыніўся на асноўных задачах сельска-гаспадарчай кааперацыі.

— Перад с.-г. кааперацыяй,—кажа тав. Гантман,—стаіць задача генэральнай праверкі ўсёй сыстэмы пад лёзунгам ажыцьцяўленьня клясавай лініі. Найбольш важным пытаньнем зьяўляецца зараз хлебазагатоўкі і загатоўкі сыравіны. Гэта ня толькі эканамічнае, але і палітычнае пытаньне.

Далей т. Гантман застанаўляецца на справе сацыялістычнага спаборніцтва. Трэба павесьці па гэтаму шляху шырокія масы працоўных. Сацыялістычнае спаборніцтва павінна стаць мэтадам далейшай работы па ахопу новых мас гораду і вёскі. У прыватнасьці, па лініі с.-г. кааперацыі сацыялістычнае спаборніцтва не разгарнулася. Трэба настойліва і цьвёрда выконваць дагаворы.

Тав. Гантман кажа, што ў нас слаба выкарыстоўваецца самакрытыка.

НЯ ВЫКОНВАЮЦЦА ПЛЯНЫ ПА ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЮ.

У заключным слове т. Дубіна адзначыў, што Наркамзем ня выканаў дырэктывы аб землеўпарадкаваньні калгасаў. Да 1-га кастрычніка плян землеўпарадкаваньня выкананы толькі на 60 проц. На гэта трэба зьвярнуць пільную ўвагу.

Новы калектыўны быт зьнішчыць рэлігійную атруту

ХЛУСЬЛІВЫМ БАЙКАМ ДУХОЎНІКАЎ СУПРОЦЬПАСТАВІМ СЬВЯТА ПРАЦЫ І ПЕРАМОГІ НА ФРОНЦЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПЕРАБУДОВЫ НАШАЙ ВЕСКІ—СЬВЯТА ЎРАДЖАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Папоўскія „пакровы" заменім сьвятам ураджаю і калектывізацыі.

У пачатку дзесятага веку—у 910 годзе на горад Канстантынопаль, які ў той час называўся Візантыяй, напалі сарацыны.

А ўнутры гораду, як і ва ўсёй краіне, панавала нездаволеньне. Галодныя народныя масы патрабавалі палепшаньня свайго матар'яльнага становішча, яны адмаўляліся ісьці ў бой і паміраць там за катаў.

Становішча набывала сур'ёзны характар. У паветры выразна пачало папахваць буйнымі народнымі непарадкамі.

І тады імпэратар Візантаі Леў шосты зьвярнуўся за дапамогаю да сваіх верных слуг—да праваслаўных папоў.

Рэлігія, як і заўсёды, прышла на дапамогу манархіі, бо ратуючы яе яна ратавала і сябе.

У гэты час у Візантыі жыў нейкі Андрэй юрадзівы. Яго ўсе лічылі чамусьці „сьвятым", хоць „сьвятасьць" яго была досыць дзіўнай. Напрыклад, ён вельмі любіў хадзіць па гораду голым, чапляцца з цынічнымі жартамі да жанчын, наведваць шынкі і дамы распусты.

І вось гэтага „сьвятога" візантыйскія папы выбралі галоўнай дзейнай асобай для сваёй „цудоўнай" камэдыі. Першага кастрычніка (па новаму стылю чатырнаццатага) „сьвяты" Андрэй разам з другім такім-жа, як і ён сам, шалахвостам, сваім вучнем Эпіданітам (у будучым стаў патрыярхам) заявіў усяму народу, што ў адным з візантыйскіх храмаў з ім здарыўся „цуд".

Багародзіца, абкружаная анёламі і сьвятымі, зьявілася ў паветры, малілася за ўсіх веруючых і разьвінула над імі свой „пакроў"—нешта накшталт хусткі ці павязкі на галаву.

І гэта нібы ў знак таго, што яна бязупынна дбае аб Візантыі і дапамагае ёй біць яе надворных і ўнутраных ворагаў.

Ну, рэч простая, „багародзіцу" гэту бачылі толькі „сьвяты" Андрэй і яго вучань Эпіданіт. Іншыя не „ўдастоіліся".

Папы разьнесьлі пагаласку аб гэтым „цудзе" па ўсёй Візантыі. А хутка Леў шосты, праўда, без дапамогі боскай, але проста пры дапамозе падкупленых ім туркаў разьбіў і прагнаў са сваёй краіны сарацын.

І толькі шмат пазьней, калі частку грэцкіх царкоўнікаў разам з таварамі перапраўлялі ў Русь для „хрышчэньня" рускага народу, толькі тады ўстанавілі яны гэта нітогодняе сьвяткаваньне „пакрова прасьвятой багародзіцы", прыставаўшы яго да чатырнаццатага, па старому стылю да першага кастрычніка.

* * *

Мы ня будзем тут даводзіць усю недарэчнасьць самога „цуда". Гэта ясна само па сабе, тым больш што цяпер ужо навукаю даказана, што і самой „прасьвятой багародзіцы", як гістарычнага тыпу, ніколі ня было.

Чым-жа тлумачыцца, што гэта сьвята „пакрава" прывілося ў нас, асабліва на вёсцы?

Тлумачыцца гэта тым, што сьвята гэта каляндарна супадзе з вельмі значнымі момантамі ў жыцьці нашага селяніна. Чатырнаццатае кастрычніка служыць пераломным момантам восені на зіму. Да гэтага часу ўсе палявыя, гародні і садовыя работы ўжо закончаны, жанчыны бяруцца ўжо за зімовыя хатнія работы—прадуць і інш.

На „пакрава" звычайна селянін робіць розныя плацяжы, закупае прадукты і мануфактуру на зіму, прадае лішкі свайго хлеба—усё гэта таму, што ўраджай рэалізаваны, таму, што ў кішэні ў селяніна ёсьць грошы.

Папы, вядомая справа, улічылі ўсе гэтыя эканамічныя прычыны, якія падмывалі нашага селяніна сьвяткаваць гэты дзень.

Пуды жыта, яйкі, сыры, масла і грошы—усё гэта досыць шчодра цякло ў папоўскія бяздонныя кішэні.

* * *

Някультурнасьць, цямнота, страх перад сіламі прыроды, якія селянін вельмі часта ня можа сабе навукова ўявіць, надзвычайная раздробленасьць шматлікіх сялянскіх гаспадарак—усё гэта штурхала, а часткова штурхае яшчэ і зараз маласьвядомага селяніна да папа, да адурманьваючай і зьнішчаючай у ім веру ў свае сілы рэлігіі.

— Маліся «прасьвятой багароіцы», падпарадкавайся цару і абшарніку,—пераконвалі яго на ўсе спосабы папы.

Яны моцна трымаюцца за рэлігійныя сьвяты—за ўсе гэтыя „пакровы", „увядзеньні ў храм", Юр'і, Сямёнавы і іншыя дні. Моцна трымаюцца, таму што адчуваюць як у вёсцы ўжо высьлізгае глебе з-пад іх ног.

14-га кастрычніка ў нас таксама вельмі вялікае, вельмі важнае для нас сьвята.

Гэта наша сьвята дзень ураджаю і калектывізацыі.

Менш раздробленых сялянскіх гаспадарак, менш цямноты ў савецкай вёсцы! Больш калгасаў, больш хат-чытальняў, больш сапраўднай сацыялістычнай культуры ў гушчы бядняцка - серадняцкіх мас!

І тады канчаткова будуць разьбіты і поп, і ксёндз, і рабін, і сэктант, і кулак, і нэпман.

* * *

Пралетарыят у цесным саюзе з бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства разаб'е канчаткова нашых заклятых клясавых ворагаў іншай зброяй. Гэта зброя—шпаркая індустрыялізацыя нашай савецкай краіны, калектывізацыя нашай сельскай гаспадаркі.

Н. Бяліна-Падгаецкі.

НА КАРЫСЬЦЬ ТРАКТАРНАЙ КАЛЁНЫ.

У гэтым годзе ў г. Барысаве загадзя пачалася падрыхтоўчая праца ў зьвязку з яўрэйскімі асеньнямі сьвятамі.

На ўсіх фабрыках, заводах і установах ставіліся даклады растлумачальнага характару аб контр-рэвалюцыйнай ролі клерыкалізму.

На гораду і раёну наладжан быў шэраг антырэлігійных вечароў з дакладамі. Кіно для рабочых і служачых і іх утрыманцаў.

На ўсіх вечарох аднагалосна ўхвалена было працаваць у яўрэйскія сьвяты „Рош-гашоно", «Іом-кіпур».

Рабочыя друкарні адпрацавалі ў рэлігійныя дні ў карысьць трактарнай калёны; заработак іх склаў суму каля 100 рублёў. Не адсталі ад друкароў і швэйнікі, а таксама і рабочыя іншых прадпрыёмстваў.

13 і 14 кастрычніка (судны дзень—дзень вялікага посту) па ўсіх школах будуць наладжаны вечары з калектыўным наведваньнем кіно. 14-га кастрычніка ва ўсіх школах будуць гарачыя сьнеданьні.

У Нова-Барысаве 13 кастрычніка наладжваецца вялікі інтэрнацыянальны вечар для яўрэйскага насельніцтва з удзелам 5-ці навучальных установ.

Рабочыя заводаў і фабрык абяцаюць распаўсюдзіць поўнасьцю да 14 кастрычніка 7.000 білетаў лётарэі «ОЗЕТ».

Рабкор І. Клябанаў.

ПАНОВАМУ

Выкопваюць бульбу машынай.

Саўгас „Станіслававa", Дубр. раёну, Арш. акругі.

14-га кастрычніка школы працуюць.

Адбыўся агульны сход настаўнікаў гор. Барысава і Нова-Барысава.

Сход заслухаў даклад аб гісторыі сутнасьці яўрэйскай рэлігіі і аб неабходнасьці рашучай барацьбы з ёю і з яўрэйскім клерыкалізмам.

На канкрэтных фактах дакладчык (настаўнік Гурэвіч) ілюстраваў контр-рэвалюцыйны твар рэлігіі і характарызаваў мэтады барацьбы з ёю ў школах.

Сход пастанавіў, каб у дзень 14-га кастрычніка, які супадае з рэлігійнымі сьвятамі—з судным днём (Іом кіпур) у яўрэяў і з „пакравамі" ў хрысьціян,—каб у гэты дзень школы Барысава і Нова-Барысава працавалі, ня гледзячы на тое, што гэты дзень прыпадае на панядзелак—дзень адпачынку.

На гэтым вечары сход пастанавіў, каб усе настаўнікі Барысаўшчыны прынялі ўдзел у арганізацыі трактарнай калёны.

З. Соскін.

СЯРГЕЙ ФАМІН.

ЗА НОВЫЯ ДНІ.

(УРЫВАК З ПАЭМЫ).

11.

Тлумна ў даль зацокалі вагоны.
Горад мой! Да завірух—бывай!
За дваццатым дальнім перагонам
Зашуміць мне ветліва трава.

Адплываюць трубы за паляны,
Нікне горад дальні у імгле.
Ах, хутчэй!
і першую стаянку
Засьцілае кучаравы лес.

Даль мая!
Напевы першай гліцы,
Залатога вечара загар,
Звон сірэн,
Крышталь жывых крыніцаў
І густы бярозавы пажар!

Спазнаю ізноў вас, дарагія,
Хоць і там,
Дзе былі хутары,
Пабудованы зусім другія
Ля гаёў у калгаскія двары.

Бачу сам, і гэта ўжо ня казка,
Як пад дым квітнеючых бяроз
Выяжджаюць трактары з саўгасаў
У занізкі золакавых рос.

Мы расьцём ўсё вышай з кожным
годам,
Ліся песьня звонкая ў радкі.
Ці-ж даўно з пахмураных заводаў
Заміралі дальнія гудкі?

Ці-ж даўно палаў наш край пажарам
Йшлі паўстанцы з стальлю гострых
кос.
І у далях задуменна-карых
Замярзаў апошні паравоз?

Заарaлі ворагаў акопы.
І на новых маладых палёх
Рассыпае трактар ціхі лёскат
І калгас на касагоры лёг.

. . . .

Звоняць, цокаюць
і цокаюць вагоны,
Пралятаюць станцыі ля нас.
За дваццатым блізкім перагонам
Мая бацькаўшчына,
мой калгас.

12.

Вось скончан шлях
(а поезд адыходзіць)
Табе паклон, дваццаты перагон!
Зялёны гай юнацтва сьпеў заводзіць,
Знаёмы дзед выходзіць на пэрон.

— Здароў, сынок!
Даўно цябе чакалі!
— Здароў, дзядуня!
Як-жа ты жывеш?
Ад радасьці і словы наплывалі
І блыталіся дзіўна ў галаве.

— А вось жыву!
За гэтымі гаямі
Мы без цябе сабраліся ў калгас.
І вось цяпер шырокімі палямі
Два трактары загрукацелі ў нас.

. . . . .

Мы кожны цьвік ўбівалі да адказу
Расьлі дамы,
Мацнеў наш калектыў.
І, як адзін, мы працавалі разам,
Каб расьцярэбіць ніцыя кусты.

Цяпер штогод у нас буйнее колас
Мы старыну пакінулі даўно.
У нас свая адчыненая школа
ёсьць лікпункт, чытальня і кіно.

Лікпункт я скончыў,
Вось навіны, братка.
Магу чытаць,
Нішто сабе—пісаць.
На зьезд Саветаў еду дэлегатам
Аб дасягненьнях нашых расказаць!

Гаворыць дзед, а клумак на калёсах,
(Ня ўгледзіў, як мы да калёс дайшлі?)
І вось паехалі на сонечныя плёсы
Дзе першыя рамашкі зацьвілі.

ДЗЕНЬ УРАДЖАЮ І ПЫТАНЬНЕ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ.

На старонках друку ўжо адзначалася месца жывёлагадоўлі ў Беларусі ў параўнаньні з жывёлагадоўляй у іншых частках нашага Саюзу, і, як гавораць аб гэтым лічбы, удзельная вага БССР у жывёлагадоўлі Саюзу—3,4 проц. Што датычыцца сьвіней, то яны складаюць 12 пр. (па СССР). На 100 дзес. пасеву прыходзіцца жывёлы пры пераводзе на буйную: па СССР—82,9, па РСФСР—89,0, УССР—49,5 і па БССР—108,6.

Лічбы гэтыя яскрава падкрэсьліваюць параўнаўча значную вагу жывёлагадоўлі ў Беларусі. Што-ж датычыцца ўдзельнай вагі жывёлагадоўлі ўнутры БССР, дык аб гэтым ня менш яскрава гавораць процантныя адносіны прадуктаў жывёлагадоўлі да прадукцыі ўсёй сельскай гаспадаркі па гадох.

Калі ўзяць усю прадукцыю сельскай гаспадаркі за 100 проц., дык прадукцыя жывёлагадоўлі складае ў 1925-26 г.: валавая—37,7 проц., таварная—43,1 проц., у 1926-27 г.—валавая—37,4, таварная—49,5 проц. і ў 1927-28 г. валавая—39,0 пр. і таварная—57,1 проц.

Гэтыя лічбы яскрава гавораць, што палова ўсёй прадукцыі сельскай гаспадаркі Беларусі як па агульнай, гэтак і па таварнай частцы складае прадукцыя жывёлагадоўлі.

Але ўсё-ж сучаснае становішча жывёлагадоўлі здаволіць нас ня можа, бо тэмп росту яе прадукцыі не адпавядае росту запатрабаваньняў як вёскі, так і гораду на прадукты жывёлагадоўлі.

Выкарыстаньня апошніх ведаў і прыёмаў тэхнікі.

Ажыцьцяўленьне арганізацыі буйных жывёлаводных стад ідзе праз шпаркі рост калектыўных гаспадарак з аграмаджаньнем у іх галіне жывёлагадоўлі.

Па прыблізных падліках з агульнай колькасьці 1679 калгасаў Беларусі жывёлагадоўля ўжо абагулена ў 75 пр. гаспадарак, што зьяўляецца ўжо значным дасягненьнем. Як вынік абагуленага жывёлаводства ўжо адзначаецца лепшае яго ўтрыманьне і скарыстаньне, якое падвысіла ў бягучым годзе гадавы ўдой каровы да 65 пуд., замест сярэдняга ўдою на Беларусі ў 57 пуд.

Максымальнае ўкамплектаваньне калгасаў жывёлай дасьць магчымасьць ня толькі павялічыць колькасьць прадуктаў жывёлагадоўлі, але падвысіць ураджайнасьць глебы.

Сьвята „Дню ўраджаю і калектывізацыі" павінна ўлічыць пералічаныя перавагі ад утварэньня вялізарных стадаў—фабрык малака і мясапрадуктаў шляхам абагульваньня жывёлагадоўлі і стварыць яшчэ большы рух да калектывізацыі.

Толькі праз супольную апрацоўку глебы, толькі праз супольнае ўтрыманьне і скарыстаньне жывёлай на вялізарных абшарах глебы магчыма з прыбыткам весьці сельскую гаспадарку і задаволіць прадуктамі жывёлагадоўлі сельскае насельніцтва і індустрыяльную рабочую клясу.

У ліку грунтоўных мерапрыемстваў

НЕ КАМЕНЬНЕ НА ДАРОЗЕ, А КАРНЯПЛОДЫ Ў АГАРОДЗЕ



Яўрэйскі калгас „Надежда", Гомельскае акругі

Вялізарны зьдзьвіг, зроблены рэвалюцыяй, абудзіў вёску да большай увагі адносна здавальненьня сябе больш спажыўнымі прадуктамі харчаваньня; адсюль зусім зразумела, што значная частка мяса, сала і малочных прадуктаў затрымліваецца ў вёсцы для здавальненьня ўзрастаючых яе патрэб. Аналёгічныя прычыны няўхільна падвышаюць патрэбы гарадоў і рабочых цэнтраў.

У сувязі з правадзімым партыяй курсам на вялізарны тэмп індустрыялізацыі краіны праблема жывёлагадоўлі высоўваецца цяпер са ўсёй сур'ёзнасьцю і вастратой. Гэта праблема цесна зьвязана з арганізацыяй снабжэньня індустрыяльных цэнтраў прадуктамі харчаваньня.

Вялізарныя запатрабаваньні на мяса і малочныя прадукты сустракаюць на сваім шляху тормазы ў выглядзе: а) масы распыленых дробных спажывецкага тыпу гаспадарак і б) як вынік першага, сыстэматычны недахоп кармоў.

Зьнішчэньне гэтых грунтоўных недахопаў магчыма толькі шляхам арганізацыі буйных гаспадарак з мэханізаванай апрацоўкай глебы і абслугоўваньня і эксплёатацыі значных жывёлавых стад на базе аграмаджанага сэктару на 1929-30 г. павінна ўвайсьці:

1) Праціяг аграмаджэньня жывёлагадоўлі.

2) Прыняцьце рашучых мер да папаўненьня стада калгасаў і саўгасаў за кошт 100 проц. застаўленьня годнага маладняку на племя з сваіх гаспадарак і арганізацыі максымальнай закупкі племянной і прадукцыйнай жывёлы.

3) Укамплектаваньне сваіх стад лепшымі вытворнікамі ўсіх відаў жывёлы і арганізацыя злучпунктаў.

4) Уцяпленьне і прыстасаваньне хлявоў для жывёлы.

5) Арганізацыя перапрацоўкі малака як у гаспадарцы, так і праз кааперацыю.

6) Стварэньне лепшых і штучных выпасаў.

7) Прыняцьце рашучых мер як да грунтоўных, так і да павярхоўных палепшаньняў сенажацяў.

8) Пашырэньне плошчы пад травамі і коранеклубняплодамі.

9) Арганізацыя і закладка сілосаў.

10) Прыстасаваньне арганізацыйнага пляну паляводства да запатрабаваньняў жывёлагадоўлі.

Я. Ляховіч.

Кантрактацыю на службу калектывізацыі.

Сучасны пэрыяд у разьвіцьці сельскай гаспадаркі характэрны тым, што мы ўступілі ў пэрыяд зьнішчэньня стыхійнасьці сялянскай вытворчасьці на аснове вытворчага аб'яднаньня паасобных, індывідуальных сялянскіх гаспадарак. У гэтай вялізарнейшай справе вытворчай арганізацыі асноўных мас сельска-гаспадарчых таваравытворцаў, у справе масавай калектывізацыі індывідуальных, карлікавых, распыленых сялянскіх гаспадарак, у справе аграмаджаньня працы ў іх, у справе пераводу ніжэйшых форм калектывізацыі ў вышэйшыя і т. д., надзвычайна вялікая роля адводзіцца сельска-гаспадарчай кааперацыі, якая ўсё больш і больш становіцца арганізуючай сілай сялянскай гаспадаркі.

Сельска-гаспадарчая кааперацыя па сутнасьці свае працы павінна стаць сапраўды вытворчай кааперацыяй, якая павінна разгарнуць масавае кааперавaньне, масавы ахоп шырокіх сялянскіх бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі. Вялікае значэньне ў справе вытворчага кааперавaньня індывідуальных сялянскіх гаспадарак мае кантрактацыя. Кантрактацыяй мы дасягаем мэтаў сапраўднай масавай арганізацыі сялянскай вытворчасьці, мы ёю ўносім плянавасьць у распыленую сельскую гаспадарку, шляхам арганізацыі вытворчасьці, мы вырашаем загатавіцельныя задачы сельска-гаспадарчай прадукцыі.

Кантрактацыя магутны рычаг масавага кааперавaньня сялянскіх гаспадарак і арганізацыі вялікіх пасеўных масываў, шляхам аб'яднаньня сялянскіх індывідуальных надзелаў. Трэба адзначыць, што вялізарнае рэканструкцыйнае значэньне кантрактацыі сказалася ў тым, што ў ёй задачы чыста вытворчыя і арганізацыйна - гаспадарчыя цесна пераплецены паміж сабою.

Кантрактацыя ня толькі ўкараняе ў сялянскую гаспадарку агратэхнічныя мерапрыёмствы, ня толькі нясе селяніну вытворчую дапамогу, але і стварае масавыя вытворчыя аб'яднаньні, дзе паступова назапашваюцца элемэнты калектывізацыі сродкаў вытворчасьці і працы для пераходу ў больш высокія формы аграмаджаньня гаспадаркі. Такім чынам кантрактацыя ня толькі вядзе да тэхнічнага ўзьняцьця сельскай гаспадаркі, але і да яе сацыялістычнай перабудовы.

У 1927-28 годзе па БССР было законтрактавана 47 тысяч гэктараў пасеваў розных культур. Плян кантрактацыі яравых пасеваў на 1928-29 гаспадарчы год быў вызначаны ў 98 тысяч гэктараў г. зн. больш, чым на 100 проц. Як-жа выканана было гэтае заданьне? Трэба адзначыць, што плянавыя меркаваньні нявыканаyы па яравых культурах. Замест 98 тысяч гэктараў законтрактавана было толькі 80934 гэктары. Праўда, ужо заданьне па кантрактацыі жыта пасеву гэтага году выканана цалкам, нават з перавышэньнем. Замест 30000 га па плянавых меркаваньнях законтрактавана 32792 га. Трэба адзначыць, што ў справе кантрактацыі жыта адстаюць Бабруйская і Гомельская акругі: першая выканала заданьне на 95 проц. і другая на 93,2 проц.

Чым тлумачыцца тое, што плянавыя меркаваньні па кантрактацыі выконваюцца ўсё-ж нездавальняюча? Акрамя аб'ектыўных умоў, якія перашкаджаюць шырокаму разьвіцьцю кантрактацыі, і якія іншы раз цяжка адхіліць, мы маем часта нядбайныя, няўважлівыя адносіны да кантрактацыі з боку нізавых мясцовых савецкіх органаў і грамадзкіх арганізацый. Мы маем такое становішча, калі пытаньнем кантрактацыі на мясцох займаецца выключна сетка сельска-гаспадарчай кааперацыі, а іншыя органы і арганізацыі ёй не дапамагаюць. Зразумела, што пры такіх адносінах да кантрактацыі мы ня будзем мець посьпехаў у гэтай галіне працы. Трэба зрабіць кораны пералом у гэтай справе, кантрактацыя павінна быць у цэнтры ўвагі ўсіх мясцовых органаў і арганізацый, бо адна сетка с.-г. кааперацыі з гэтаю вельмі важнаю задачаю ня справіцца.

Выходзячы з задач вытворчага кааперавaньня сельскай гаспадаркі, мы павінны адзначыць, што кантрактацыя ў БССР як сродак сацыяльнай перабудовы індывідуальных сялянскіх гаспадарак яшчэ сябе ня выявіла. Ва ўмовах БССР кантрактацыя больш носіць характар чыста камэрцыйнай загатоўкі сельска-гаспадарчай прадукцыі і менш усяго мае рыс вытворчай перабудовы сельскай гаспадаркі. Напрыклад разьвіцьцё і арганізацыя розных таварыстваў, шляхам кантрактацыі, толькі пачынае заражджацца. Такім чынам мы бачым, што ўзьдзеяньне кантрактацыі на сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі надзвычайна слабае і яна ў асноўным у нас носіць характар пакуль што камэрцыйнай зьдзелкі.

Мы ведаем, што кантрактацыя, апрача ўсяго іншага, ставіць мэту ўзьняцьця агратэхнікі сельскай гаспадаркі. Між тым і гэта задача, таксама вельмі важная, не ажыцьцяўляецца. Агрaмінімум кантрактанты ня выконваюць, кантроль належны па выкананьню дагавароў адсутнічае, аграномы, дзякуючы перагрузцы іншаю працаю, не дапамагаюць і ня сочаць, каб узятыя на сябе абавязкі кантрактанты выконвалі. Усё гэта зводзіць кантрактацыю да надзвычайна вузкіх задач і яна траціць сэнс магутнага рычага перабудовы сельскай гаспадаркі на сацыялістычных асновах.

Магутнае разьвіцьце кантрактацыі і вытворчае кааперавaньне сталі магчымымі ў выніку прымяненьня так званай безавансавай кантрактацыі. У мінулую яравую пасеўкампанію быў зроблен каранны пералом пераходу кантрактацыі ад авансавай да безавансавай. Авансавая кантрактацыя стварала вялікія перашкоды шырокаму разьвіцьцю кантрактацыі, бо яна патрабавала мабілізацыі значных сродкаў зьверх дзяржаўнага фінансаваньня сельскай гаспадаркі. Безавансавая кантрактацыя ў некаторых частках СССР шырока прымянялася, між тым у нас у БССР безавансавая кантрактацыя праводзілася пазаплянавым парадкам і ня мела шыракага распаўсюджаньня.

Безавансавая кантрактацыя праводзілася як вопыт, па льну ў Віцебскай і Полацкай акругах, у першай было законтрактавана 779 га, у другой 582 га. У Бабруйскай акрузе таксама мела месца безавансавая кантрактацыя, там было законтрактавана 828 гэктараў пасеваў розных культур.

Трэба адзначыць, што безавансавая кантрактацыя мае значна больш перавaг, чым авансавая. Безавансавая кантрактацыя павінна стаць сапраўды масавай, авансы павінны выдавацца і скарыстоўвацца выключна на мэты вытворчай дапамогі бядняцкім сялянскім групам вёскі і слабым матар'яльна калгасам.

Кантрактацыя, як сродак вытворчага аб'яднаньня індывідуальных сялянскіх гаспадарак, прызвана адыграць вялізарную ролю ў барацьбе з капіталістычнай верхавінай вёскі, у справе падначаленьня кулацкіх гаспадарак плянавым нашым меркаваньням. Масавыя вытворчыя аб'яднаньні, якія павінны ўзрастаць на аснове кантрактацыі, ствараюць умовы пераводу цэлых вёсак, пасёлкаў на грамадзкую апрацоўку зямлі.

Асноўным мэтадам пераводу элемэнтарных вытворчых аб'яднаньняў у вышэйшую форму калектывізацыі зьяўляецца доўгалетняя кантрактацыя. Гэта форма дагаворнай сувязі з насельніцтвам замацоўвае вытворчыя аб'яднаньні, якія ўтвараюцца на аснове кантрактацыі і дае мажлівасьць пераводзіць іх працу на складаныя, разлічаныя на шэраг гадоў аграрызацыйна вытворчыя пляны, якія прадугледжваюць увядзеньне рацыянальнага севазвароту і цыклю агратэхнічных і арганізацыйн. мерапрыёмстваў, што дае мажлівасьць перавёсьці аб'яднаньне ў поўны калгас. Доўгалетняя кантрактацыя ставіць мэту ўзьняць вытворчасьць ня толькі аднэй галіны гаспадаркі, але і ўсёй гаспадаркі ўдзелым. Гэта акалічнасьць робіць доўгалетнюю кантрактацыю сродкам сапраўднай перабудовы сялянскай індывідуальнай гаспадаркі.

У нас па БССР доўгалетняй кантрактацыяй было ахоплена ўсяго 3 тысячы гэктараў пасеву. Плянавыя меркаваньні па доўгалетняй кантрактацыі ў нас ня выкананы. На шырокае распаўсюджаньне доўгалетняй кантрактацыі трэба будзе зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Цікава адзначыць, што цэнтральнае месца ў нашай кантрактацыі займае серадняк. Калгасы займаюць усяго 11,8 проц. у адносінах да агульнай кантрактуемай плошчы. Такім чынам гэта акалічнасьць яшчэ больш ставіць перад намі актуальную задачу зрабіць кантрактацыю сапраўдным рычагом сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

У сучасны момант ідзе падрыхтоўчая праца да правядзеньня сьвята „Дню ўраджаю і калектывізацыі". Як у час падрыхтоўкі, так і ў час правядзеньня сьвята неабходна максымум увагі аддаць справе кантрактацыі. Кантрактацыю неабходна паставіць на службу калектывізацыі, на службу сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Я. М.

НДІ у „Дзень ураджаю і калектывізацыі"

Навукова-Дасьледчы Інстытут Сельскае і Лясное гаспадаркі Беларусі імя Леніна будзе абслугоўваць наступныя сельска-гаспадарчыя выстаўкі:

з 13-Х—у Цэнтральным Доме Селяніна;

13—14-Х—на тэрыторыі балотнай станцыі;

13-14-Х—на тэрыторы сьвінаводнай станцыі (м. Сьлапянка);

14-Х—пры саўгасе «Атоліна» для некалькіх сельсаветаў Самахвалаўскага раёну;

13-Х—у камуне «Чырвоны Сьцяг» для калгасаў, саўгасаў і сялянства чатырох сельсаветаў Койданаўскага р.;

з 13 па 20 кастрычніка ў Пухавіцкім, Самахвалавіцкім, Смалявіцкім і Заслаўскім раёнах, а таксама і падшэфным Азярыцка-Слабодзкім с-с.

На гэтых выстаўках будуць пастаўлены экспанаты і будуць давацца тлумачэньні: па паляводству і насеньняводству, культуры балот і лугаводству, культуры бульбы, гадоўлі сьвіней, ахове расьлін ад шкоднікаў і хвароб.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

аб мерапрыёмствы для палепшаньня ўмоў навучаньня студэнтаў вячэрніх Рабфакаў.

Для палепшаньня ўмоў навучаньня для слухачоў вячэрніх рабочых факультэтаў і вячэрніх індустрыяльных рабочых тэхнікумаў—Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Для вучняў вячэрніх рабочых факультэтаў і вячэрніх індустрыяльных рабочых тэхнікумаў зьменшыць рабочы дзень у вытворчасьці да 6-ці гадзін, за выключэньнем тых вучняў, ад работы якіх залежыць работа значных груп рабочых (майстры, падмайстры, брыгадзіры і працуючыя на конвэйеры).

Аплата адпаведнымі прадпрыёмствамі асоб, якім рабочы дзень скарочан да 6 гадзін, не павінна быць меншай, як ім належала пры месячнай або зьдзельнай працы, пры ўмове выкананьня імі цалкам устаноўленае нормы для першых шасьці гадзін працы. У выпадку перавышэньня альбо зьмяншэньня гэтае нормы аплата ўтвараецца, як і астатнім катэгорыям рабочых.

Гэтая пастанова пашыраецца на пэрыяд заняткаў у паказаных у гэтым артыкуле навучальных установ і ажыцьцяўляецца з 1 верасьня 1829 г.

2. Абавязаць прадпрыёмствы даваць рабочым-слухачом вячэрніх рабочых факультэтаў і вячэрніх індустрыяльных рабочых тэхнікумаў на час праверачных работ у навучальных установах, паказаных у арт. 1 гэтае пастановы, кароткатэрміновыя адпачынкі агулам ня звыш, чымся на адзін тыдзень бяз выплаты заработку за гэты час.

3. Абавязаць прадпрыёмствы даваць чарговы адпачынак, замест двухтыднёвага месячны з захаваньнем заработнае платы рабочым-слухачом вячэрніх рабочых факультэтаў і вячэрніх індустрыяльных рабочых тэхнікумаў адзін раз на працягу ўсяго навучаньня па апошнім або прадапошнім курсе (паводле выбару слухача).

4. Даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі запрапанаваць усім прадпрыёмствам выкарыстаць усе магчымасьці для пераводу рабочых-слухачоў вячэрніх рабочых фалультэтаў і вячэрніх індустрыяльных рабочых тэхнікумаў з вячэрняй зьмены работ на дзённую, не парушаючы, аднак, інтарэсаў вытворчасьці.

5. Студэнтам апошняга (чацьвертага) курсу вячэрніх рабочых факультэтаў, якія пакінулі працу на вытворчасьці для заканчэньня навучаньня, разьмер стыпэндыі ў другой палове навучальнага году прыраўняць да разьмеру стыпэндыі першага курсу тае вышэйшае навучальнае ўстановы, пры якой знаходзіцца рабочы факультэт.

Гэты артыкул ажыцьцёвіць з 1929-30 бюджэтнага году.

6. Даручыць Народнаму Камісарыяту Працы БССР ужыць захады да правядзеньня ў жыцьцё артыкулаў 1, 2 і 3 гэтае пастановы.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССС **Л. Дубавіцкі.**

29 жніўня 1929 г.
г. Менск.

Сёньня пачынаецца рух Менскага трамваю.

Шырокае трамвайнае будаўніцтва ў СССР.

(Гутарка з інжынэрам т. Максіменкам).

Савецкі Саюз зьяўляецца адным з піянэраў электрычнага трамваю ў Еўропе. Паводле статыстычных даных, у 1927-28 годзе у СССР быў трамвай у 38 гарадох з агульным працягам шляху 2100 кілёмэтраў і 3105 штук маторных і прычэпных вагонаў. Усе трамваі перавозяць штогод да 1490 мільёнаў пасажыраў; валавы прыбытак ад трамваяў складае 123.520.000 руб. у год. Па ўсіх трамвайных прадпрыёмствах працуе да 44.500 рабочых і служачых. Штогод усе трамваі даюць каля 40 мільёнаў рублёў чыстага прыбытку і гэтыя грошы ідуць на разьвіцьцё камунальнай гаспадаркі гарадоў.



Сёняшні трамвай у Менску.

Трамвай у горадзе зьяўляецца найбольш танным і даступным грамадзкім транспартам. Першы трамвай у былой Расеі быў пабудаваны ў 1879 г. у Кіеве, у 1906 годзе было пабудавана ўжо да 14 трамвайных прадпрыёмстваў. Асабліва хуткі рост трамвайнага будаўніцтва назіраўся ў пэрыяд з 1906 да 1913 году, калі было пабудавана 18 буйных трамваяў: Маскоўскі, Ленінградзкі, Саратаўскі і інш. Большасьць трамвайных прадпрыёмстваў тады эксплёатавалася концэсіянэрамі-бэльгійцамі, немцамі і французамі.

З пачаткам імпэрыялістычнай вайны трамвайнае будаўніцтва зусім спынілася, як і наогул усё вытворчае жыцьцё краіны.

Пасьля імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайны пачынаецца адраджэньне гаспадарчага жыцьця ў краіне Саветаў. Зноў у некаторых гарадох узьнікае патрэба ў трамваі, прычым за пэрыяд з 1923 да 1928 году пабудаваны трамваі ў Баку, Багародзку, Варонежы, Цьверы, Сталіне і ў іншых мясцох—усяго 6 трамвайных прадпрыёмстваў. У 1928-29 годзе пабудаваны трамваі ў Менску, Сьвярдлоўску і Пермі.

Такім чынам, на 1 кастрычніка 1929 году ў СССР ёсьць 41 трамвайнае прадпрыемства. Мы бачым, што рост трамвайнага будаўніцтва ў СССР ідзе хуткім тэмпам.

Трэба адзначыць, што за апошнія годы з трамваем пачаў канкураваць аўтобус, але ён у СССР пакуль што не атрымаў таго значэньня, якое мае за граніцай, з прычыны высокага кошту амартызацыі і кепскага бруку ў нашых гарадох. З эканамічнага і сацыяльнага пункту погляду трамвай пакуль што ня мае канкурэнтаў.

Сёньня ўрачыста адчыняецца трамвайны рух па вуліцах гор. Менску.

Правільнасьць руху вагонаў па вуліцах з эканамічнага боку залежыць ад добрасумленных адносін да пасажыра і інвэнтару з боку абслугоўваючага пэрсаналу. Выходзячы на лінію, вагон павінен быць у парадку, кожны вагонаважаты абавязан сачыць, каб правільна эксплёатаваўся трамвайны вагон, каб ашчадна выдаткоўваць электраэнэргію. Кандуктары павінны быць вежлівы і ўважлівы ў адносінах з пасажырамі, павінны сачыць, каб ня было бязбілетных пасажыраў. Вось галоўная і асноўная задача пры эксплёатацыі трамваю.

Бышая ў Менску конка.

Мы спадзяемся, што пэрсанал трамваю выканае з гонарам усе ускладзеныя на яго Гарсаветам задачы.

ПЕРАВЫБАРЫ ПРАЎЛЕНЬНЯ БДУ.

Новы старшыня праўленьня—т. Каранеўскі Я. П.

Гэтымі днямі адбыліся перавыбары праўленьня БДУ.

У новы склад абраны наступныя таварышы: Караўнеўскі — (старшыня праўленьня, рэктар БДУ), Рыўлін (нам. рэктара), прафэсары: Вольфсон, Кроль, Усьпенскі, Прылежаеў і прадстаўнік ад студэнцтва т. Хурсік.

* * *

Каранеўскі Язэп Пятровіч нарадзіўся ў 1887 г. Паходзіць з сялян (серадняк) Менскай акругі, Заслаўскага раёну. Па сканчэньні ў 1909 годзе настаўніцкай сэмінарыі быў загадчыкам і настаўнікам прыходзкага вучылішча ў Менску. У 1914 годзе скончыў настаўніцкі інстытут, пасьля чаго працаваў настаўнікам Парыцкага выш. нач. вуч. Бабруйскай акругі.

З 1915-1917 г.—загадчык дасьледчай школы пры Менскім настаўніцкім інстытуце.

Да 1919 г. т. Каранеўскі—загадчык вопытнай школы 2-й ступені пры Менскім Інстытуце Народнай Асьветы, нам. рэктара інстытуту і настаўнік Беларускай гімназіі ў Менску.

У 1919-20 г. у часе белапольскай акупацыі тав. Каранеўскі разам з тав. У. М. Ігнатоўскім і іншымі таварышамі прымаў удзел у арганізацыі і кіруючай працы падпольнай беларускай камуністычнай арганізацыі.

Член КП(б)Б з 1920 году.

У 1920 г. быў прызначаа Рэўкомам БССР адказным сакратарам, а далей—нам. Камісара Асьветы.

У 1926 г.—выконваў абавязкі нам. старшыні Інстытуту Беларускай культуры, а ў 1927-28 г.—нам. рэктара Беларускага Камуністычнага Ун-ту па навучальнай частцы.

З 1928-29 г. нам. рэктара Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту.

Тав. Каранеўскі зьяўляецца членам Менскага гарадзкога савету усіх скліканьняў, быў 2 гады членам прэзыдыуму гарсавету, выконваў абавязкі старшыні сэкцыі Нарасьветы Менгарсавету.

„Старое і новае“

(ФІЛЬМ АБ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ САВЕЦКАЙ ВЁСКІ).

Фільм „Старое і новае“ (у ранейшых варыянтах ён меў назву „Генэральная лінія“)—праца вельмі выдатных савецкіх майстраў кіно—Эйзэнштэйна і Аляксандрава—гэтых тварцоў такіх шэдэўраў, як „Броненосец Потемкин“ і „Октябрь“. Падрыхтоўваецца ён ужо 3-4 гады і павінен адбіць генэральную лінію нашай партыі ў галіне будаўніцтва савецкае вёскі.

Некалькі разоў фільм ужо канчаўся пастаноўкай, ставіўся на грамадзкіх праглядах, але жыцьцё абганяла аб'ектыў здымачнага апарату: сапраўдная генэральная лінія нашай партыі ў галіне будаўніцтва сацыялістычнай вёскі далёка пакідала ззаду „Генэральную лінію“ Эйзэнштэйна і Аляксандрава. І фільм перараблялі. У працэсе працы было відаць, што аб'ектыву кіно-апарату ніяк немагчыма ўгнацца за тэмпам жыцьця, і „Генэральная лінія“, прыняўшы больш вузкія рамкі, фактычна зьведзеныя да катэгорыі культур-фільмаў, атрымала другую назву — „Старое і новае“ (назва, паміж іншым, няўдалая ў параўнаньні з арыгінальнасьцю ўсяго фільму — нагадвае „раней і цяпер“ з школьных насьценгазэт).

Фільм паказвае нам розныя сацыяльныя групоўкі на вёсцы, але цьвёрда акрэсьленай пастаноўкі пытаньня аб клясавай барацьбе на вёсцы ў фільму няма.

Арганізоўваецца калгас, з вялікімі цяжкасьцямі ён расьце і набывае свой аўтарытэт, а тое, што праз калгасы шлях да сацыялізму, што праз калгасы—выхад з аграрнага перанасяленьня—фільм не падкрэсьлівае.

„Справа перавыхаваньня дробнага земляробства, перабудовы ўсёй яго псыхалёгіі, усіх яго звычаяў і вераваньняў,—ёсьць справа, якая вымагае пакаленьняў“—так пісаў Ленін. Гэтыя глыбокія думкі павінны-б былі знайсьці сваё адбіцьцё ў фільме, аднак не знайшлі.

Фільм, цалкам прысьвечаны генэральнай лініі партыі ў будаўніцтве савецкай вёскі, зусім не падкрэсьлівае партыйнага кіраўніцтва дзяржавай. Твар аднаго камсамольца, які разам з усімі будуе калгас, бязумоўнага, гэтага вялікай заганы не выпраўляе. У фільме ёсьць намёкі на ўсё,—на камсамол, агранамію, рабочых шэфаў, „столпов“ бюракратыі ў горадзе, але партыі ў фільме няма. Карацей кажучы, „генэральная лінія“ ў фільму зусім вылецела—роля партыі ў будаўніцтве савецкай вёскі ня вызначана.

Глядач сочыць за фільмам з зацікаўленасьцю, але пасыўна (тут поўнае спаўзаньне да звычайнага культурфільму); фільм яго не хвалюе, ня кліча на барацьбу і змаганьне. У гэтым—другая загана фільму.

Праца Эйзэнштэйна і Аляксандрава фармальна з пастаноўчага боку, яшчэ і яшчэ раз падкрэсьлівае талент заслужаных майстраў савецкага кіно. Фільм поўны кантрастамі, параўнаньнямі, вобразамі. Кожны кадр мае дваякі сэнс, і гэта прымушае гледача больш удумліва, больш уважліва сачыць за фільмам.

Вельмі шкада, што адухаўленьня такой мастацкай працы, сацыяльнага адраджаньня талёнавітым кадрам—няма. Талёнавітыя абразкі тут-жа ня ўвязваюцца проста і выразна з канкрэтнымі задачамі калгаснага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе.

Трэба сьцьвердзіць, што калі мы тут ня маем справы з вялікім агітацыйным фільмам, які заклікаў-бы на змаганьне, дык усё-ж такі перад намі абразок вельмі культурна і ўзорна зробленага культурфільму. Калі фільм страціў сябе, як прапагандыста-агітатара, дык ён апраўдвае сваё значэньне, як фатограф, альбўшы калгаснае будаўніцтва ў СССР.

З гэтага боку, ён, бязумоўна, заслугоўвае вялікай увагі нашага рабочага гледача.

Міх. Таўба.

Адказны рэдактар **П. ШАСТАКОЎ.**

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

ДА ДНЮ ЎРАДЖАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ І ПРАДАЮЦЦА НАСТУПНЫЯ КНІГІ

1. **Кудзінаў.**—За калгасы. „Да дню ўраджаю і калектывізацыі“ . . . . . . Стар. 40. Ц. 8 к.
2. **У. Паскрэбка.**—Трактар будзіць раньне. (Пра камуну імя Карла Лібкнехта) . . Стар. 68. Ц. 10 к.
3. **Кудзінаў.** — Жыцьцё і праца комуны „Зьвязда“ . . . . Стар. 52. Ц. 10 к.
4. **Кудзінаў і Цынкоў.**—Аплата працы ў колгасах . . . . Стар. 60. Ц. 10 к.
5. **А. Балтынь.**—Даведнік калектывістага . Стар. 136. Ц. 50 к.
6. **П. Гарбуз.**—Як арганізаваць калектыўную гаспадарку . . . . Стар. 32. Ц. 6 к.
7. **Зборнік.**—Паход ЛКСМБ за ўраджай і калектывізацыю сельскаегаспадаркі . . Стар. 80. Ц. 30 к.
8. **Агр. Уліцін.**—За ўраджай, зборнік артыкулаў па сельскай гаспадарцы . . Стар. 176. Ц. 65 к.
9. **Якаўлеў.**—Барацьба за ўраджай, выд. 2-е . Стар. 80. Ц. 30 к.
10. **Проф. Вільямс.**—Проблема ўраджайнасьці . Стар. 36. Ц. 12 к.
11. **А. Рыбакоў.**—Сельска-гаспадарчая каапэрацыя і падвышэньне ўраджайнасьці . Стар. 122. Ц. 35 к.
12. **С. Тупяневіч.**—Вялікі ўраджай праз мінэральныя ўгнаеньні . . . . . Стар. 36. Ц. 10 к.
13. **А. Міхайлаў.**—Што такое агромінімум і як яго праводзіць . . . . . . Стар. 56. Ц. 10 к.
14. **М. Савіцкі і П. Трус.**—Вапнаваньне глебы Стар. 32. Ц. 5 к.
15. **Бахцеёў Я. і Савіцкі М.**—Попел як угнаеньне . . . . Стар. 24. Ц. 10 к.
16. **П. Заяц.**—Ачышчанае насеньне павялічвае ўраджайнасьць . . . . . . Стар. 32. Ц. 10 к.
17. **Проф. В. Качаткоў.** — Хэмія на службе селяніну . . . . Стар. 48. Ц. 15 к.
18. **А. Міхайлаў.**—Задачы асеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі 1929 г. . . . . Стар. 40. Ц. 10 к.
19. **А. Рыбакоў.**—Контрактацыя . . . Стар. 64. Ц. 20 к.
20. **А. Рыбакоў і І. Левіт.**—Контрактацыя, мэта і задачы, організацыя і практыка . Стар. 118. Ц. 70 к.
21. **А. Рыбакоў.**—Машыновыя таварыствы, іх організацыя і работа . . . . . Стар. 108. Ц. 30 к.
22. **Г. Маслакавец.**—Надвор'е і ўраджай . . Стар. 92. Ц. 30 к.
23. **Г. Чуйко.**—Сялянскія досьледы з мінэральнымі ўгнаеньнямі . . . . . Стар. 72. Ц. 20 к.

ХРОНІКА.

Адчынілася рабочая канфэрэнцыя Фрунзаўскага раёну.

Учора ўвечары ў клюбе Карла Маркса адчынілася шырокая рабочая канфэрэнцыя, скліканая ЦСПСБ і Фрунзаўскім райкомам КП(б)Б.

Першы год пяцігодкі мы выканалі з посьпехам. Прараканьні розных ныцікаў не апраўдаліся; мы кажа, адчыняючы канфэрэнцыю, сэкратар райкому КП(б)Б т. Гурэвіч,—пабілі ныцікаў дасягненьнямі першага году пяцігодкі.

Лёзунг—дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны— ня ёсьць мары, а сапраўднасьць бліжэйшай будучыні.

Разам з дасягненьнямі ў нас ёсьць яшчэ шэраг недахопаў і шляхам бальшавіцкай самакрытыкі мы іх павінны выявіць. Тав. Гурэвіч выказвае ўпэўненасьць, што канфэрэнцыя пройдзе пад знакам шырока разгорнутай крытыкі і самакрытыкі.

У прэзыдыум канфэрэнцыі абіраецца 35 чалавек, сярод іх т. т. Карклін, Розін, Гурэвіч і інш.

Пасьля абраньня ганаровага прэзыдыуму і зацьверджаньня парадку дню з дакладам на тэму—вынікі мінулага гаспадарчага году і кантрольныя лічбы на 1929-30 г. выступіў, сустрэнуты воплескамі ўсёй залі, **нам. старшыні СНК БССР т. Карклін.**

Пасьля дакладу разгарнуліся спрэчкі.

ВЫКЛІКАЮЦЬ НА САЦЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА.

Агульны сход навуковых і тэхнічных працаўнікоў Беларускай Акадэміі Навук выклікаў на соцыялістычнае спаборніцтва Навукова-Дасьледчы Інстытут імя У. І. Леніна.

Умовы соцыялістычнага спаборніцтва: плянавасьць працы і яе адпаведнасьць да сацыялістычнага будаўніцтва, прадукцыйнасьць працы, паглыбленьне марксысцкаленінскай ідэалёгічнай вытрыманасьці працы, устанаўленьне працоўнай дысцыпліны, эканомія матар'ялаў і сродкаў, сувязь з рабоча-сялянскімі масамі і найлепшая падрыхтоўка асьпірантаў.

Ад імя агульнага сходу супрацоўнікаў Беларускае Акадэміі Навук—МК БАН.

У прэзыдыуме Гарсавету.

Узмацніць барацьбу з няпісьменнасьцю.

Прэзыдыум Гарсавету зацьвердзіў склад камісіі па барацьбе з няпісьменнасьцю па гораду ў складзе т. т. Цэнцыпэра, Шыманскага і Рыўліна. Для лікпунтаў будуць адпускацца памяшканьні дзяржаўных і грамадзкіх установ.

Узмацніць кантроль за прыватнымі дамамі.

Прэзыдыум Гарсавету выдаў пастанову аб тым, каб пры кожным аддзяленьні міліцыі былі ўтвораны камісіі для высьвятленьня фактаў безгаспадарчасьці ў утрыманьні прыватных дамоў.

Камгас выдзяляе тэхнічную брыгаду для кантролю за дамамі прыватных асоб.

Выключэньне са складу дэпутатаў.

Прэзыдыум Гарсавету на сваім апошнім пасяджэньні зацьвердзіў пастанову мандатнай камісіі аб выключэньні са складу гарсавету за пасыўны ўдзел у працы пленумаў і сэкцый т. т. Селіванава, Вострыкава і Зьмітровіча.

Падрыхтоўка новых кадраў для спажывецкай каапэрацыі.

Прэзыдыум Менскага АВК абгаварыў справаздачу Менскага аддзяленьня Белкапсаюзу аб падрыхтоўцы кадраў для спажывецкай каапэрацыі.

За апошні год праз курсы прапушчана 134 чал. вясковых актывістаў, з іх палова рабочых, батракоў і беднякоў, а рэшта серадзякі, саматужнікі і служачыя.

Прэзыдыум АВК запрапанаваў аддзяленьню Белкаапсаюзу сачыць за сваечасовым скарыстаньнем на практычнай працы скончыўшых курсы. У мэтах сыстэматычнай падрыхтоўкі актыву дадзена ўказаньне на працягу году арганізаваць у больш буйных спажывецкіх таварыствах школы каапграматы, а ў дробных гурткі. Для вылучэньня на адказную працу ў каапэрацыі запрапанавана арганізаваць 2-месячныя курсы.

У фонд калектывізацыі.

Рабочыя бляшанага цэху заводу „Камунар“ 12 кастрычніка адпрацавалі паўтары гадзіны ў фонд калектывізацыі. Сума заробку складае каля 400 руб.

Курсы мопр'аўскага актыву.

У Менску і Барысаве адчыняюцца кароткатэрміновыя курсы для мопр'аўскага актыву.

Курсы маюць практычна перапрацаваць пытаньні працы мопр'аўскіх арганізацый.

Зімовая кампанія дапамогі палітвязьням.

З 15 кастрычніка па Менскай акрузе пачынаецца зімовая кампанія дапамогі палітвязьням.

Згодна кантрольных лічбаў, па Менскай акрузе павінна быць сабрана 15 тысяч рублёў.

Абмен вопытам працы клюбаў.

Дзеля абмену вопытам працы клюбаў праўленьне Менскага Дому Асьветы наладжвае сталую сувязь з дамамі асьветы ў акругах, а таксама раёнаў.

Апавяшчэньні.

ДА ВЕДАМА ПРАЦАЎНІКОЎ ДРУКУ.

— Сёньня роўна а 12 гадз. дню ў клюбе друкароў адбудзецца агульны сход сэкцыі працаўнікоў друку гор. Менску.

Яўка членаў сэкцыі абавязкова.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— У панядзелак 14-X г. г. роўна а 7-й гадз. увечары адбудзецца вечар, прысьвечаны дню калектывізацыі і ўраджаю.

Праграма вечару:

1. Даклад аб дню калектывізацыі і ўраджаю.
2. Даклад Шэфтаварыства Саюзу Працасьветы.
3. Справаздача сяброў н.-саюзу, езьдзіўшых для азнаямленьня з аўрэйскімі калгасамі ў Беларусі і Крыму.
4. Кіно-фільм.

Уношу і выклікаю.

Я селянін серадняк вёскі Карсаковічы, Барысаўскага раёну, Сяліцкі М. Д. уношу на абарону краіны Саветаў—на пабудову самалёту імя цэнтральнага органу ЦКК КП(б)Б—газэты „Зьвязда“ 3 рублі і выклікаю сваіх аднавяскоўцаў. Нашай дапамогай дзяржаве ўзмацнім абароназдольнасьць краіны.

СЯЛІЦКІ.

ПАПРАЎКА.

Ва ўчарашнім нумары нашай газэты ў падвальным атрыкуле „Вёска-Калгас“ па недагляду карэктуры ў 11 радку зьнізу надрукавана „пашлі пахаць картоплю“, а трэба „пашлі капаць картоплю“.

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА“.	З панядзелка 14 кастрычніка **„СТАРОЕ І НОВАЕ“.**
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	З панядзелка 14 кастрычніка амэрыканскі фільм **„НАНУК“** у 6 частках. Звыш праграмы: кіно-хроніка САВКІНО № 49. Пачатак а 7 гадзіне. Каса а 5 гадз.
КІНО ПРАЛЕТАРЫ	З панядзелка 14 кастрычніка амэрыканскі фільм **„СТАРАЯ № 99“** камэдыя ў 6 частках. Звыш праграмы: кіно-хроніка САВКІНО № 53. Пачатак—а 7 з пал. гадз. Каса а 6 гадз.
1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР“.	З панядзелка 14 кастрычніка **„ЧАНГ“** у 6 частках. Каса адчынена штодня ад 2 гад. Па нядзелям і серадох ад 12 гадз.

Судвыканаўца 2 вуч. Менскай акругі АБВЯШЧАЕ,

што за даўгі Менсельнрэдыту і прыватным асобам па выканаўчых лістох,

будуць прадавацца БУДЫНКІ

І ІНШАЯ МАЁМАСЬЦЬ НІЖЭЙПАКАЗАНЫХ ГРАМАДЗЯН.

Продаж будынкаў і маёмасьці адбудзецца на месцы іх знаходжаньня:

1) Досько Лукі—будынак па Сьлесарнай вуліцы дом № 24, ацэнка, 337 руб., а 9 гадзіне раніцы, 19 кастрычніка.

2) Доўнара Язэпа—па Кладбішчанскай вул. № 28, ацэнка 969 руб., а 11 гадзіне раніцы, 19 кастрычніка.

3) Сіпа Антося—па Савецкаму завулку, № 3, ацэнка 1722 руб., а 1-й гадзіне раніцы, 19 кастрычніка.

4) Рабецкага Пятруся—па Цьнянскай вул., № 2, а 3-й гадз. дня, 19 кастрычніка, ацэнка 1269 руб.

5) Размоўка Кастуся—па Берасьцянскай вуліцы, № 8, ацэнка 280 руб., а 10 гадз. раніцы, 25 кастрычніка.

У выпадку, калі першыя таргі не адбудуцца, паўторныя таргі назначаюцца першых 4-х на 11-е лістапада, а 5-га па 12 лістапада ў тыя самыя гадзіны, што і на першых таргох.

Жадаючыя таргавацца запрашаюцца на паказаныя гадзіны на месца таргоў. Аб усіх справах і ўмовах можна даведацца штодзённа ў Бюро Судвыканаўцаў вул. К. Маркса, дом, № 5.

Судвыканаўца 2 вуч. Менск. акругі ПЕНКРАТ.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

МАГІЛЕЎСКАГА АКРУГОВАГА АПТЭКАКІРАЎНІЦТВА на 1-га кастрычніка 1928 году.

АКТЫЎ

I. Маемасьць.		
1. Нярухомая	554—50	
2. Інвэнтар	30222—83	
3. Нясконч. капіт. рамонт	1328—03	32105—36
II. Грашовыя сродкі:		
4. Каса ў кіраўніцтве	509—85	
5. „ прадпрыёмствах	3444—93	
6. Бягучыя рахункі	10477—91	
7. Пераводы ў дарозе	1205—00	15637—69
III. Каштоўныя паперы:		
8. 8%-я гарантыйная пазыка	5000—00	
9. Іншыя дзяржпазыкі	479—05	5479—05
IV. Паі і акцыі	110—00	110—00
V. Тавары:		
11. У цэнтральным складзе	56841—79	
12. „ аптэках	71304—71	
13. „ магазынах	23496—28	
14. „ дарозе	19744—17	
15. „ лекрасьліны па нарыхтоўк.	1898—80	173285—75
VI. Вэксалі да атрыманьня:		
16. У партфэлі	2303—70	
17. „ вучоце	4600—00	
18. Пратэставаныя	60—00	6963—70
VII. Дэбітары:		
19. Пакупнікі	21379—24	
20. Дастаўшчыкі	1379—04	
21. Розныя	8403—79	
22. Служачыя	615—85	
23. Няпэўныя даўгі	115—11	31893—03
VIII. 24. Выдаткі будучых год	3691—70	3691—70
IX. 25. Іншыя актывы	150—47	150—47
БАЛЯНС		269316—75

ПАСЫЎ

I. Капіталы:		
1. Асноўны	27014—60	
2. Зваротны	52199—00	
3. Запасны	30406—26	109619—86
II. Фонды і рэзэрвы:		
4. Фонд палепшаньня быту раб. і служачых	3832—69	
5. Фонд амартызацыі маёмасьці	5065—87	
6. Фонд няпэўных даўгоў	175—11	
7. Іншыя фонды і рэзэрвы	1555—12	10628—79
III. 8. Банкі па вучоту вэксаляў	4600—00	4600—00
IV. 9. Вэксалі выдадзеныя	56897—15	56897—15
V. 10. Падсправаздачныя асобы	4—59	4—59
VI. Крэдытары:		
11. Пакупнікі	13784—94	
12. Дастаўшчыкі	9104—95	
13. Розныя крэдытары	6879—67	
14. Служачыя	6259—73	36029—29
VII. 15. Іншыя пасывы	532—94	532—94
VIII. 16. Прыбытак справаздачн. году	51004—13	51004—13
БАЛЯНС		269316—75

Рахунак прыбыткаў і страт.

ДЭБЭТ.

1. Агульна-гандлёвыя выдаткі	168099—37
2. Процанты выплачаныя	5417—97
3. Амартызацыя маёмасьці	1536—09
4. Рэзэрвы і фонды	702—38
5. Магілеўскае акр. т-ва Чырвонага крыжу за прыбытак па магазыну № 3	2651—35
6. Розныя страты	798—18
7. Чысты прыбытак	51004—13
Баланс	230209—47

КРЭДЫТ.

1. Прыбытак ад рэалізацыі тавараў	225470—26
2. Прыбытак ад лябараторыі	1343—60
3. Ад загатовак лекавых расьлін	63—42
4. Процанты атрыманыя	1308—58
5. Ад пералічэньня не скарыстан. фонду няпэўных даўгоў	242—85
6. Камітэт Чырвонага Крыжу за выдаткі па маг. № 3	1559—02
7. Розныя прыбыткі	221—74
Баланс	230209—47

Час. вык. аб. заг. аптэкакір. **БРОДЭРЗОН.**

Бухгальтар **ПОЛУГАЕЎСКІ.**

Баланс і рахунак прыбыткаў і страт зацьверджаны сталай балянсавай камісіяй пры Магілеўскім Акрфінаддзеле 30-VII-29 г. (прат. № 10 і Прэзыдыумам АВК 19-VIII-29 г. (прат. № 17 п. 487) і да друку дазволен.

Інспэктар Магіл. Акрфа **БАРОЎСКІ.**

Народны Суд Жлобінскага раёну на падставе свайго прыгавору ад 7-VIII—1929 г. па крымінальнай справе № 953 па абвінавачваньню былога старшыні Салтанаўскага крэдытнага т-ва, Жлобінскага раёну ў наступны момант. Старшыня Чырвона-Барэзінскага крэд. т-ва Ганчарова Сьцяпана Алесява па 197 з карн. санкцыяй 213 арт. К.К. абвяшчае грамадзкую ганьбу за нядбайныя адносіны да сваіх абавязкаў, як старшыні т-ва выразіўшыяся ў тым, што нягледзячы на распараджэньні вышэйстаячых органаў аб водпуску корму выключна пайнікам маёчнага т-ва дапусьціў безвучотную выдачу гэткіх па свайму пагляду і непайшчыкам гэткага.

Менскі ЗАГС выклікае гр-на Карнева Аляксандра Аляксандравага на 28 кастрычніка 1929 г. па справе аб скасаваньні шлюбу з гр-кай Карневай Ольгай Вікенцьевай.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Паявая кніжка № 661 Праташчыка У. І., выд. Старадароск. спаж. т-вам, кв. 660п.

— Паявая кніжка № 1535 Мельніка Х., выд. Старадароскім спаж. т-вам, кв. 660п.

— Паявая кніжка № 305 Гарбаля М. П., выд. Старадароск. спаж. т-вам, кв. 660п.

— Вучотна-конская кніжка Емельянава А. П., выд. Старадароск. Райвыканкамам, кв. 660п.

— Пасьведчаньне за № 332 Сладкоўскай Г. П., кв. 662п.

— Паявая кніжка Быкава М., выд. Крупскім спаж. т-вам, кв. 662п.

— Паявая кніжка № 90 Волка, выд. Бобрскім спаж. т-вам, кв. 663п.

— Паявая кніжка № 38 Волка Н., выд. Бобрскім спаж. т-вам, кв. 663п.

— Паявая кніжка № 89 Марозава Н., выд. Бобрскім спаж. т-вам, кв. 663п.

— Паявая кніжка № 456 Страшка, выд. Бобрскім спаж. т-вам, кв. 663п.

— Паявая кніжка № 607 Князева, выд. Бобрскім спаж. т-вам, кв. 663п.

— Паявая кніжка № 471 Шарэтава, выд. Бобрскім спаж. т-вам, кв. 663п.

— Паявая кніжка № 916 Гіра, выд. Бобрскім спаж. т-вам, кв. № 663п.

— Паявая кніжка № 897 Сіроткіна, выд. Бобрскім спаж. т-вам, кв. 663п.

— Конская кніжка № 1582 Сінішына, выд. Крупскім конскім вуч. № 13, кв. 663п.

— Паявая кніжка № 1004 Варановіча, выд. Бобрскім спаж. т-вам, кв. 663п.

— Пасьведчаньне № 238 Гарадзінскай, выд. Бобрск. сямігодкай, кв. 663п.

Галоўлітбел 535.